PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl

№ 51 (2432) Год XLVII | Беласток, 22 снежня 2002 г. | Цана 2,00 зл.

Гродзенскія прадпрымальнікі на Беласточчыне

Аляксандр Вярбіцкі

У днях 5 і 6 снежня 2002 года Беласточчыну наведала група прадпрымальнікаў з Гродна. Адбылося гэта ў рамках рэалізаванага Цэнтрам грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь праекта „Ладжанне самаўрадавага супрацоўніцтва ў галіне малых і сярэдніх прадпрыемстваў Гродзеншчыны і Падляшша"; праект фінансава падтрымала Брытанскае пасольства ў Варшаве.

Дэлегацыя беларускіх прадпрымальнікаў прадстаўляла шырокі спектр гаспадарчых суб'ектаў; былі тут людзі, якія займаюцца турызмам, грузаперавозкамі, прыроднымі лекамі, вытворчасцю шкла, ачысткай і збераганнем вады, кавальствам, будаўніцтвам, пракладкай труб, экалогіяй, кравецтвам, апрацоўкай драўніны і гандлем. Напачатак сустрэліся яны з адказнымі працаўнікамі Ваяводскай управы ў Беластоку Яраславам Варобеем і Эвай Мацяк.

Спадар Варобей паінфармаваў, што кіраўнікі Падляшша і Гродзеншчыны год назад падпісалі пуцяводны ліст пра ўзаемнае супрацоўніцтва. Цяпер адбываюцца кансультацыі і дапрацоўкі і ў студзені 2003 года мае быць падпісана афіцыйнае пагадненне між Гродзеншчынай і Падляшшам. Яно мае даць магчымасць ладзіць больш шчыльныя кантакты між абодвума бакамі ў надзвычайных абставінах, земляробстве і ахове асяроддзя; ваявода абмежаваны заканадаўствам толькі да гэтых галін, апошнімі займаецца Ваяводскі сеймік.

Эва Мацяк, згадваючы пра новы візавы рэжым, заявіла, што не будзе складанасцей у атрыманні новых візаў. Прадбачваюцца візы доўгатэрміновыя і недарагія.

У наступную чаргу дэлегацыя беларускіх прадпрымальнікаў сустрэлася з прэзідэнтам горада Беластока Рышардам Турам, якога суправаджалі віцэ-прэзідэнты Мар'ян Блехарчык і Рышард Зімнох. У сустрэчы прыняла ўдзел і прадстаўніца пасольства Вялікабрытаніі ў Польшчы Аляксандра Гласка.

Спадарыня Гласка паведаміла, што мерапрыемства праводзіцца ў рамках праграмы трохбаковага супрацоўніцтва з Украінай, Беларуссю і Калінінградскай вобласцю Расіі, пра якое дамовіліся міністры замежных спраў Польшчы і Вялікабрытаніі ў 2000 годзе. Мэтай такога супрацоўніцтва з'яўляецца падтрымка дэмакратыі і рынкавай эканомікі ў Беларусі і Украіне шляхам супрацоўніцтва са структурамі Еўрасаюза. Важную ролю ў гэтай дзейнасці ўскладаецца на прыгранічнае рэгіянальнае супрацоўніцтва і скарыстанне польскага

[працяг ☞ 2]

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

„W-Z Orkiestra" ў гайнаўскім белліцэі

Перасяканне межаў

Мікола Ваўранюк

— „Бязмежжа" павінна выходзіць на шырэйшыя прасторы, — сказаў Юры Гумянюк. — Таму, лічу, добра сталася, што сёлетні семінар прайшоў разам з літаратурным фестывалем часопіса „Карткі".

Польска-беларускі літаратурны семінар „Бязмежжа" ладзіцца Беларускім саюзам у Рэчы Паспалітай з 1996 года. Пастаянным месцам яго правядзення з'яўляецца Беларускі музей у Гайнаўцы. Сёлетняе, сёмае па чарзе мерапрыемства праходзіла ў днях 6-7 снежня. У гэты ж час беластоцкі літаратурна-мастацкі часопіс „Карткі" праводзіў свой трэці фестываль „Свет на абочыне".

„Карткі" былі першым польскім выданнем, якое змясціла падборку беларускай літаратуры, створанай у 1990-х гадах. Яго рэдактары амаль ад пачатку ўдзельнічалі ў „Бязмежжы". У бібліятэчцы часопіса выйшлі кніжкі перакладаў паэзіі Алеся Разанава і „Народнага альбома" Міхала Анемпадыстава. Паколькі трэці фестываль „Свет на абочыне" праходзіў пад назвай „Вялікае княства паэтаў" і меў на мэце прэзентацыю сучаснай паэзіі з абшараў былога Вялікага княства Літоўскага, дык само сабой разумеецца, што шляхі абодвух мерапрыемстваў у многіх месцах перакрыжаваліся.

На агульным спатканні польскіх, літоўскіх і беларускіх паэтаў у беластоцкім клубе „Фама" свае вершы прэзентавалі: Міра Лукша, Алесь Аркуш і Юры Гумянюк. А Зміцер Вайцюшкевіч з гуртом „W-Z Orkiestra" даў канцэрт беларускіх балад і песень на словы Уладзіміра Караткевіча. Гэты сам гурт выступіў наступнага дня ў Беларускім ліцэі ў Гайнаўцы. Шкада, што людзей са-

[працяг ☞ 3]

Лявону Вашко, беларускаму празаіку з Мастоў, які ўпершыню пасля 25 гадоў выбраўся ў Польшчу (на наша „Бязмежжа"), мытнікі канфіскавалі ягоныя выданні, якія ён хацеў падарыць калегам у Польшчы. На гэтыя выданні склаліся: кніга „Гістарызацыя свядомасці" (10 асобнікаў), часопіс „Маленькі сшытак" (7 асобнікаў) і газета „Дзеячас" (51 асобнік розных нумароў). Мытнікі не кранулі ў Л. Вашко толькі кнігі „Паэты-цары", выдадзенай у *афіцыйным* выдавецтве. Названыя раней выданні былі саматужнай вытворчасцю пісьменніка, чыноўнікі затрымалі іх для экспертызы — „ці не наносяць яны часам урону дзяржаве". Выпадак Л. Вашко адказвае цалкам на пытанне, якое з рознай напругай нервовасці ставіцца чытачамі на Інтэрнэт-форумах: *Чаму часопісу „Правінцыя" нельга купіць у шапіках Мінску ці іншых гарадоў?* А менавіта таму нельга, што адзіным магчымым спосабам направіць „Правінцыю" ў Беларусь з'яўляецца кантрабанда. Няма ніводнай фірмы як з польскага, так і з беларускага боку, якая займалася б легальным абаротам прэсай і кнігай паміж абедзвюма краінамі. Да таго ж, чытаеш навіны з Беларусі і здзіўляешся. Вось прэзідэнт заяўляе, што залье Еўропу нелегальнымі імігрантамі і наркотыкамі, спыніўшы памежны кантроль. Але адсачыць на той жа мяжы кнігу — вось дзе нагода паказаць чыноўніку сваю пільнасць, рупнасць, дзейнасць... (ам)

Нашым чытачам і іх блізкім, якія Каляды адзначаюць па новым стылі, жадаем прыемнага святочнага адпачынку. Рэдакцыя

Макаўка ў Еўропе ☞ 4

Беларусы, грамадзяне Польшчы, жыхары Макаўкі, Міхалова, Чыжоў ці Беластока маюць яшчэ і дадатковую прычыну, каб быць зацікаўленымі ўваходам краіны ў Еўропу. Еўрасаюз па сваёй логіцы не пераносіць шавінізму. Можа ў Еўропе загіне гэты ірацыянальны страх, які паралізуе мышленне „нашага хлопца" і прымушае яго пастаянна хавацца ад самога сябе.

Свяжынка ў Мінску ☞ 5

Прафесарка пачаставала нас смажанай свежанінкай. Мы елі і расхвальвалі вынаходлівасць беларускай гаспадыні. На момант забыліся, што гасцюем у еўрапейскай сталіцы. Здавалася — мы ў роднай хатцы на Беласточчыне, дзе толькі што закалолі вепрука пад Каляды.

Дружба... нты ☞ 9

Заставалася дзесяць дзён да вяселля, калі хлопец ля яе школы сказаў, што бацька катэгарычна забараніў яму браць удзел у гэтым „прадстаўленні" ў царкве. Бацька яго (з тыповым беларускім прозвішчам) стаяў на каленях перад тэлевізарам і плакаў, калі трансліравалі візіт папы рымскага ў Польшчы, хаця ўмеў рабіць людзям розныя свінствы, расказваў яго сын.

Родам з Беласточчыны ☞ 10

Выдатны беларускі і рускі фізік і оптык Аляксандр Гяршун нарадзіўся ў 1868 годзе ў горадзе Саколка на Беласточчыне. Бацька яго Леў Гяршун быў доктарам у Саколцы, вельмі адукаваным чалавекам. Таму ён вельмі хацеў, каб і сын атрымаў таксама добрую адукацыю. Ён адправіў Аляксандра на вучобу ў Віленскую гімназію, дзе юнак сур'ёзна вывучаў замежныя мовы і матэматыку.

Беларускі каляндар на 2003 год

☞ у наступным нумары,
☞ у продажы — ад 24 снежня 2002 г.

Беларусь — беларусы

Выбарчы рытуал

У Беларусі распачалася перадвыбарчая кампанія. Ужо прайшоў першы этап — фармаванне тэрытарыяльных выбарчых камісій. Калі прааналізаваць папярэднія вынікі, значнага адрознення ад мінулых выбарчых кампаній не назіраецца.

Як замежныя, так і беларускія палітыкі, калі гавораць пра недэмакратычнасць выбараў у Беларусі, маюць на ўвазе вялікую колькасць фальсіфікацый, зробленых сябрамі выбарчых камісій. Раней самым распаўсюджаным парушэннем была выдача бюлетэняў з прозвішчамі кандыдатаў у дэпутаты на прад'яўленыя некалькі пашпартоў. Так жонка галасавала за мужа, ці наадварот, альбо за ўсю сваю вялікую сям'ю галасаваў яе галава. За савецкім часам такі грэх асаблівым грахом і не лічыўся, бо выбіралі часцяком з адной кандытатуры, ды і самі выбары насілі дэкаратыўны характар. Падчас перабудовы погляды на гэтую рэч змяніліся — канкуруючыя кандыдаты і назіральнікі ад іх стараліся не дапусціць, каб волевыяўленне асобнага выбаршчыка ажыццяўлялася праз іншага чалавека, хай сабе і самага роднага і блізкага. Канфлікты, што ўзнікалі на гэтай глебе на выбарчых участках былі ў большай ступені выкліканы нежаданнем членаў гэтых самых камісій працаваць да самага канца дня галасавання, бо калі статыстычна прагаласавалі ўсе грамадзяне, што жывуць на дадзеным участку, можна зачыняць дзверы, падлічваць бюлетэні і разыходзіцца па дамах.

Апошнія выбары ў мясцовыя органы ўлады, што адбыліся ў Беларусі ў 1999 годзе, не мелі вострага накалу палітычнай барацьбы. Адна з прычын таго — фактычны байкот з боку большасці апазіцыйных палітычных партый. З другога — адмыслова зменшаныя паўнамоцтвы мясцовых Саветаў. За некалькі гадоў перад гэтым выбарныя органы ўлады былі скасаваны ў раёнах буйных гарадоў — усе паўнамоцтвы на кіраванне самай дробнай адміністрацыйнай адзінкай узяла на сябе выканаўчая ўлада, якая, зразумела, нікім не выбіраецца. Больш таго, з непасрэднага падпарадкавання гарадскіх і абласных Саветаў былі выведзены адпаведныя выканаўчыя камітэты. У выніку, стасункі паміж імі сталі нагадваць адносіны паміж суседзямі, што жывуць у адным доме ўжо даўно і толькі добразычлівасць прымушае распавядаць аб справах, што робяцца ў іх кватэрах. Такімі былі справаздачы супрацоўнікаў выканкамаў на сесіях прадстаўнічай улады. І хаця фармальна самае галоўнае — прыняццё ці не прыняццё бюджэту заставалася за апошнімі — нікому нават у галаву не прыходзіла, што той ці іншы Савет можа не ўхваліць вывад спецыяліста выканаўчага камітэта, які „лепей" ведае адкуль і куды мусяць ісці грошы ад збору мясцовых падаткаў. Важным паказальнікам цікаўнасці да работы Саветаў стала значна меншая колькасць на іх сесіях прадстаўнікоў прэсы, чым на пасяджэннях выканкамаў.

Нягледзячы на фактычнае статус-кво ў выбарным заканадаўстве з тых недалёкіх часоў, зараз амаль усе палітычныя партыі адмовіліся ад ідэі байкоту выбараў і актыўна сталі вылучаць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі. Аднак асаблівага жадання з боку той жа выканаўчай улады і вышэйшага органа таго ці іншага Савета ўключыць у склад камісій палітычна ангажаваных грамадзян не было. Амаль паўсюдна падлічваць галасы выбаршчыкаў у сакавіку будуць вылучэнцы працоўных калектываў, праўрадавых грамадскіх арганізацый і тыя і іншыя, якія назбіралі неабходную для вылучэння ў склад камісіі колькасць подпісаў мясцовых жыхароў. Праўда, часцяком імі аказваюцца кіраўнікі дробных рангаў рознага кшталту дзяржаўных прадпрыемстваў, што ў сённяшняй беларускай рэчаіснасці цалкам залежаць ад той самай прэзідэнцкай „вертыкалі". А як гаварыў Сталін — не важна як галасуюць, важна хто падлічвае.

Па ўсёй Беларусі ў склады камісій з палітычных партый трапілі ў асноўным прадстаўнікі прапрэзідэнцкай Кампартыі Беларусі і ўмоўна апазіцыйных — Партыі камуністаў і Ліберальна-дэмакратычнай партыі, што пачыналася калісьці як беларускае крыло партыі Жырыноўскага. Таму расклад тэрытарыяльных камісій з часоў леташніх і пазалеташніх выбараў у палітычнай ангажаванасці не змяніўся. Але ёсць крыху абнадзейваючае — па папярэдніх звестках у склад Мінскай гарадской камісіі трапіў сябра Беларускага народнага фронту, партыі, што стаіць у жорсткай апазіцыі да сённяшняй беларускай улады. Нешта падобнае адбылося яшчэ па прыкладна дзясятку тэрытарыяльных камісій па ўсёй краіне. А ўсяго такіх камісій 1 600. Таму, гэтыя выпадкі ўяўляюць сабой выключэнне, якое пацвярджае прыкрае правіла — у даны момант беларускія выбары больш нейкі рытуал, чым сапраўднае народнае волевыяўленне.

Уладзімір Лапцэвіч

Нашай супрацоўніцы **Яўгеніі Палоцкай**
словы шчырага спачування з прычыны напаткаўшага яе гора
— **смерці Маці** —
выказвае рэдакцыйны калектыў „Нівы".

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У Гайнаўцы з беларускімі прадпрымальнікамі спаткаўся намеснік старасты Ежы Сірак (стаіць злева), побач стаіць старшыня ЦГА Польшча-Беларусь Марцін Рэмбач

Гродзенскія прадпрымальнікі...

[1 ☞ працяг]

вопыту суседзямі. Беласток з'яўляецца адзіным, па-за Варшавай, цэнтрам, які актыўна ўдзельнічае ў гэтым праекце.

Старшыня беларускай дэлегацыі Віктар Сазонаў сказаў, што беларускія прадпрымальнікі знаходзяцца сёння ў цяжкіх абставінах, аднак іх прадпрымальніцкі патэнцыял моцны, бо яны не толькі выжылі на беларускім рынку, але і выходзяць навонкі. А Беласточчына з'яўляецца найпершым напрамкам такога выхаду, бо з Гродзеншчынай тут многа супольнага, асабліва адзіная светапоглядавая база, якая дазваляе аднолькава бачыць усе праблемы. Беласточчына дае выхад на Захад, а Гродзеншчына — на Усход.

Прэзідэнт Беластока Рышард Тур заявіў пра зацікаўленне ўлад горада кантактамі з Гроднам і выказаў надзею, што сустрэчы спародзяць канкрэтныя вынікі.

Віцэ-прэзідэнт Беластока Мар'ян Блехарчык, адказны за міжнародныя кантакты, прыгадаў, што нашы гарады наладзілі супрацоўніцтва ў 1994 годзе. Спектр узаемных кантактаў шырокі: бізнес, культура, асвета, самакіраванне. Сёння, да 2003 года, дзейнічае дамова між гарадамі, падпісаная ў 2000 годзе, і ўлады хочуць, каб яна давала надзею на добрыя эканамічныя кантакты.

Віктар Сазонаў звярнуў увагу на складанасці супрацоўніцтва, згадваючы пра розныя эканамічныя сістэмы ў нашых краінах і спытаў, як выходзіць на кантакт з Польшчай, мінуючы тамашнія структуры ўлады.

Спадар Блехарчык адказаў, што ў Польшчы ўлада не гуляе ўручную ў бізнес, а закон ахоўвае прадпрымальніцтва. Найбольш паспяховы непасрэдны кантакт бізнесавых арганізацый, бо яны найлепш зарыентаваныя ў рэаліях.

Чарговае спатканне адбылося ў Генеральным консульстве Рэспублікі Беларусь у Беластоку з консулам Аляксандрам Карачуном. Паколькі Консульства не займаецца прадпрымальніцтвам, гутарка мела агульны характар. Гаспадарчыя справы курыруе Гандлёва-эканамічны аддзел Пасольства РБ у Варшаве, тэлефон у Варшаве 617-84-41.

Старшыня Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь Марцін Рэмбач паінфармаваў, што Цэнтр адкрыў сайт на польскай мове з інфармацыямі пра Беларусь; адрас сайта **www.bialorus.pl**. На сайце можна знайсці не толькі навейшыя палітычныя і эканамічныя навіны з Беларусі, але і аналізы тамашніх эканамічных працэсаў, каталог фірм Гродзеншчыны ды змест найважнейшых беларускіх законаў для прадпрымальнікаў: гандлёвага і інвестыцыйнага кодэксаў. Сайтам цікавілася ўжо звыш 30 тысяч наведвальнікаў.

Адбыліся яшчэ спатканні гродзенскіх гасцей з прадпрымальнікамі Беластока і Гайнаўшчыны.

Аляксандр Вярбіцкі

* * *

Госці з Гродзеншчыны наведалі Белавежскую пушчу, а на наступны дзень спаткаліся з намеснікам старасты Гайнаўскага павета Ежы Сіракам. Віцэ-староста пазнаёміў беларускіх прадпрымальнікаў з найбольшымі прадпрыемствамі павета. Уручыў ён гасцям рэкламныя матэрыялы аб гмінах і прадпрыемствах Гайнаўшчыны. Беларускую дэлегацыю цікавілі магчымасці гаспадарчага і турыстычнага супрацоўніцтва. Такое супрацоўніцтва прадбачваецца паміж пагранічнымі раёнамі Польшчы і Беларусі ў рамках Еўрарэгіёна „Белавежская пушча". Улады еўрарэгіёна спадзяюцца атрымаць сродкі з польскага бюджэту і еўрапейскіх фондаў. Вядуцца намаганні адкрыць турыстычны пераход у Грудках каля Белавежы.

— Нашыя прадпрымальнікі шукаюць кантактаў з краінамі Еўрасаюза, звяртаюць увагу на Беласточчыну, бо блізка яна для нас па менталітэце і гістарычных традыцыях. Цікавяць нас кантакты з польскімі прадпрымальнікамі, праз якія можам выходзіць на суседнія рынкі, — сказаў у Гайнаўцы Віктар Сазонаў. — Зараз у Беларусі вельмі цяжкія ўмовы для прадпрыемстваў, якія займаюцца пастаяннай вытворчасцю. Існуе пагроза закрыцця прадпрыемстваў па задуманых прычынах. Лягчэй прадпрымальнікам, якія займаюцца гандлем.

Беларускія прадпрымальнікі прыехалі з канкрэтнымі прапановамі.

— Я хачу наладзіць супрацоўніцтва ў галіне будаўніцтва і турызму. Хацеў бы таксама выконваць у Польшчы свідравіны, — сказаў Сяргей Зылькоў, уласнік прадпрыемства з абмежаванай адказнасцю „Свідравіна", якое супрацоўнічала з будаўнікамі газаправода „Ямал".

Перад ад'ездам госці наведалі гайнаўскіх прадпрымальнікаў. Пазнаёміліся яны з вытворчасцю прадпрыемства „Руна" з Гайнаўкі, якое перапрацоўвае плады лесу. Сустрэліся з кіраўніцтвам дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў і пабывалі ў Сельскагаспадарчым прадукцыйным кааператыве „Рольмак" у Макаўцы.

Аляксей Мароз

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

Лявон Вашко

Перасяканне межаў

[1 ☞ працяг]

бралося няшмат, бо невядома калі Гайнаўка будзе мець нагоду пачуць такіх артыстаў. Атмасферу канцэрта падагрэлі фанаты гурту, якія патушылі электры момант, каб падвесці вынікі зробленага і пагутарыць пра будучыню. А вакол „Правінцыі" згуртаваўся ладны такі літаратурны гурт. Перш-наперш трэба было б назваць паэтаў рычнае святло і запалілі знічы. А наканец спявалі разам з Вайцюшкевічам найбольш вядомыя яго песні.

Супольны быў таксама выезд у Цісоўку, у своеасаблівую літаратурную кавярню галоўнага рэдактара „Картак" Багдана Дудко. Сарганізаваў ён яе ў доме сваіх дзядоў і прынамсі раз у год запрашае туды людзей неабыякавых да прыгожага слова. Цісоўка ўсяго дзесяць кіламетраў ад Свіслачы. Госці з Беларусі былі пад уражаннем такіх самых краявідаў, падобнага выгляду падляшскіх вёсак і мястэчак. Сяргей Астраўцоў з Гродна звярнуў быў нават увагу, што такіх краявідаў, матываў памежжа, беларуска-польскай правінцыі не хапае ў флагмане „Бязмежжа" — часопісе „Правінцыя".

Сёмае „Бязмежжа" было задумана менавіта як сустрэча аўтараў „Правінцыі". Два выпускі альманаха, гэта добрасюк сумняваўся, ці такі нумар атрымаецца. Нельга загадаць пісьменніку тэму, па заказе не можна напісаць добрага твора, даказваў. Гэтыя два полюсы дыскусіі зышліся ў адным: без тэкстаў няма часопіса. Хутчэй за ўсё, наступны выпуск „Правінцыі" будзе пабудаваны, як і два ранейшыя, вакол добрых тэкстаў.

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

Вінцэсь Мудроў, Юры Гумянюк, Алесь Аркуш

Юрыя Гуменюка і Алеся Аркуша, празаікаў: Вінцэся Мудрова, Лявона Вашко і Сяргея Астраўцова, а з нашых беластоцкіх: Міру Лукшу і Міхася Андрасюка. Асобнае месца займаюць у „Правінцыі" пераклады сусветнай літаратуры. Але перакладчыкі на семінары адсутнічалі.

Старшыня Беларускага саюза Яўген Вапа выступіў з прапановай зрабіць манаграфічны нумар „Правінцыі" пра 1939 год на Беласточчыне і Гродзеншчыне. Гісторыкі на гэтую тэму ўжо выказваліся, а вось мастацкіх напрацовак не хапае, гаварыў ён. Міхась Андрасюк сумняваўся, ці такі нумар атрымаецца. Нельга загадаць пісьменніку тэму, па заказе не можна напісаць добрага твора, даказваў. Гэтыя два полюсы дыскусіі зышліся ў адным: без тэкстаў няма часопіса. Хутчэй за ўсё, наступны выпуск „Правінцыі" будзе пабудаваны, як і два ранейшыя, вакол добрых тэкстаў.

Сяргей Астраўцоў ажыццявіў свой пастулат. Два дні пасля семінара даслаў тэкст пра перасяканне беларуска-польскай мяжы, які няскончаны ляжаў у ягонай шуфлядзе некалькі гадоў.

Мікола Ваўранюк

Новае ў Бельску

Расце зацікаўленне Бельскам, што спрычыняецца да паправы якасці жыцця яго жыхароў. Ажыццяўленне шматлікіх складаных гаспадарчых задач горада патрабуе актыўнага ўдзелу і адказнага супрацоўніцтва гарадскіх і павятовых органаў самакіравання. Пра галоўныя інвестыцыі, праводзімыя гарадскім самакіраваннем у 2002 годзе спытаў я загадчыка Аддзела інвестыцый і публічных заказаў Гарадской управы ў Бельску-Падляшскім, інжынера **Валянціну ШЫМЧУК**.

На басейне

У гэтым годзе прадаўжалі мы будову крытага басейна, найбольшага мерапрыемства ў гарадскім бюджэце. Гэтага важнага фізкультурнага аб'екта жыхары горада чакаюць шмат гадоў. Выконваецца ён з прымяненнем сучасных тэхналогій для шматгранных функцый. Ён энергаэканомны і будзе задавольваць усе спатрыўныя і эрганамічныя патрабаванні. Будуць ім карыстацца маладыя людзі, якія вучацца плаваць, або займаюцца аматарскім і высокакваліфікаваным спортам ды карысна праводзяць час. Басейн дасць магчымасць праводзіць рухавую рэабілітацыю, а дзякуючы адсутнасці архітэктурных бар'ер спрыяць будзе інтэграцыі здаровых людзей з інвалідамі. Апрача басейна размерам 25 х 12,5 метраў будзе там адпачынкова-рэабілітацыйны бродзік, ванна з гідрамасажам, круглагадовая з'язджальня і 110 месц для публікі. Апрача гэтага будуць санітарныя вузлы з душамі, салярый, сауна, адсек для біялагічнай рэактывацыі ды адміністрацыйныя, сацыяльныя, гаспадарчыя і тэхнічныя памяшканні.

За гэты год, да 21 лістапада, зрасходавана ўжо 3 645 тысяч злотаў, у тым ліку 504,5 тысячы датацыі ад Управы фізкультуры і спорту. Будаўнічыя працы выкананы ў 78%, санітарныя ў 95%, электрычныя ў 43%, а звязаныя з тэхналогіяй падрыхтоўкі вады — у 24%. Завяршэнне будовы цэлага комплексу прадбачваецца на канец кастрычніка будучага года.

На вуліцах

Працягваючы штогадовыя захады дзеля паправы выгляду нашага горада і выгады карыстання камунікацыямі, праведзена комплексная мадэрнізацыя вуліцы Сянкевіча, з пракладкай сцёкавых і дажджавых труб і вымашчэннем яе брусчаткай. Распачаліся прыгатаваўчыя працы дзеля мадэрнізацыі вуліцы Паўночнай. Завершана пракладка санітарнай каналізацыі па вуліцах Жарневіча і Яна Паўла II (павятовая вуліца) у рамках супольнага са Старостам мерапрыемства. Выканана таксама асвятленне аўтобуснага завароту па вул. Міцкевіча.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Завяршаецца абліцоўка крытага басейна

Так як і ў мінулых гадах праводзіліся лінейныя мерапрыемствы з удзелам грамадскіх камітэтаў пабудовы, якія ўносілі прадбачваемы рэгламентам уклад 30% вартасці інвестыцыі; апошнія 70% фінансавала Гарадская ўправа. Такім чынам пабудаваны водаправод па вуліцах Беластоцкай, Заходняй і Шпітальнай, а па вуліцы Абвадовай пракладзена санітарная і дажджавая каналізацыя і вымашчана яна брусчаткай. Па вуліцы Пагоднай пракладзены санітарная каналізацыя і водаправод.

Міхал Мінцэвіч

Гміны Бельскага павета ў сеціве

Мая чарговая інтэрнэтавая экскурсія па гмінах Бельскага павета накіравалася ў Вышкі. На жаль, няма асобнай старонкі пра гэту гміну, але інфармацыю аб ёй можна знайсці на сайце Бельскага павета: http://www.powiatbielski.cp.pl/ . Там, між іншым, даведаецеся, што ў Вышкаўскай гміне жыве 5 225 чалавек, а 22% тэрыторыі гміны займаюць лясы. Да інфармацыі прыкладзены прафесійна зробленыя здымкі.

Трохі больш можам даведацца пра мястэчка Браньск і Браньскую гміну. На старонках Бельскага павета: http://bisi.and.pl/ можна пазнаёміцца з гісторыяй, культурай, помнікамі і сабраць агульныя звесткі. Напрыклад, што на 1 000 жыхароў у гміне прыпадае 13,3 лекара. Больш змястоўная інфармацыя даецца на старонцы http://www.cp.pl/bransk_um/. У раздзеле „Агульныя звесткі" прыводзяцца даволі дэталёвыя статыстычныя даныя. Напрыклад, колькі ў гэтым раёне лясоў, садоў і г.д. З думкай аб турыстах падаецца прыгодная гасцям інфармацыя і карта мястэчка, якую можна аддрукаваць на хатнім прынтэры. Змешчаны таксама весткі пра мясцовыя ўлады.

Пра Боцькаўскую гміну на сайце Бельскага павета інфармацыі вельмі мала. Цікавым для мяне адкрыццём з'явілася старонка фонду EKOLAND: http://www.ekoland.pl/. Гміна супрацоўнічае з гэтай установай, што дае больш магчымасцей для развіцця рэгіёна, а інвестарам лягчэй знайсці сабе прапанову. Іншыя весткі можна знайсці па адрасе: http://bocki.of.pl/. Даецца там сціплая гісторыя мястэчка і невялікая галерэя. Шкада, што так мала, бо многія інтэрнаўты цікавяцца Боцькамі, аб чым сведчыць лічыльнік на апошняй старонцы: ад 06.06.2002 гэтую старонку наведала 1 240 чалавек!

Рафал Галушэўскі

Апазіцыя на прыцэле

(заканчэнне; пачатак у 49 нумары)

Кіраўнік Гродзеншчыны

Як перад распадам СССР, гэтак і пазней, пакуль да ўлады не прыйшоў Лукашэнка, кожны чарговы старшыня Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта не пярэчыў, калі яго называлі ваяводам. Пры Лукашэнку слова „ваявода" замянілі на „губернатар".

Палітык Сямён Домаш, былы старшыня выканаўчай улады Гродна, а пасля і вобласці, паходзіць з Заходняй Беларусі. Яго мара — пабудаваць новую Беларусь, дзе людзі, незалежна ад нацыянальнасці, жылі б аднолькава добра. Пры ім у Лідзе быў пастаўлены помнік Адаму Міцкевічу, а мы атрымалі дазвол на пабудову польскіх школ у Гродне і Ваўкавыску. Домаша звольнілі з пасады, бо ён падтрымаў імпічмент Лукашэнку і, нягледзячы на ціск, не адмовіўся ад свайго подпісу. З 1996 года ён не можа знайсці ў Беларусі працы. Дзеля таго, каб перашкодзіць яму актыўна ўдзельнічаць у апазіцыйным руху, паводле загаду прэзідэнта быў распачаты судовы працэс з мэтай адабраць дом, які Домаш прыватызаваў згодна з беларускім заканадаўствам. Праз пяць гадоў суд пазбавіў яго права ўласнасці, хоць пакуль ніхто не выстаўляе Домаша на вуліцу. Такім чынам уладам зручна нейтралізаваць сваіх палітычных супраціўнікаў.

На прэзідэнцкіх выбарах у 2001 годзе Сямён Домаш быў кандыдатам ад беларускіх рэгіёнаў. Дзеля яго рэгістрацыі сабрана 150 тысяч подпісаў, больш меў толькі Лукашэнка, але не ў Гродне. Пасля выступу па беларускім тэлебачанні абсалютна здаровы чалавек пачуўся дрэнна і трапіў у шпіталь з інфарктам. На падставе канфідэнцыйнай інфармацыі, якую дактары паведамілі супрацоўнікам выбарчага штаба Домаша, можна зрабіць выснову, што інфаркт быў выкліканы штучна. Нядаўнія наступствы пасля ўжывання спецыяльных сродкаў у Маскве падчас вызвалення закладнікаў толькі пацвярджаюць гэтую версію.

Свабода слова — за кратамі

Мікола Маркевіч, былы гродзенскі лідэр БНФ, дэпутат беларускага парламента 12-га склікання і рэдактар газеты „Пагоня", быў асуджаны на паўтара года зняволення разам са сваім калегам Паўлам Мажэйкам за тое, што адважыўся змясціць у газеце перадрук (з указаннем крыніцы інфармацыі), з якога вынікае, што прэзідэнт Лукашэнка падазраецца ў знішчэнні сваіх палітычных апанентаў.

Пасля знішчэння і закрыцця „Пагоні" больш за дзесятак журналістаў страцілі працу. Безработная жонка і трое дзяцей Маркевіча вымушаны жыць на выпадковыя ахвяраванні.

Маркевіч, беларус, змагаўся за правы палякаў у Беларусі. У сваіх прамовах падчас працы ў парламенце ён падтрымліваў нашы нацыянальныя інтарэсы, у тым ліку патрабаванне будаваць польскія школы на грошы дзяржаўнага бюджэту, а не за кошт польскіх падаткаплацельшчыкаў. Разам з намі ён удзельнічаў ва ўсіх пікетах і акцыях у абарону правоў чалавека ў Беларусі.

Ціск узмацняецца

Віктар Івашкевіч, галоўны рэдактар газеты „Рабочы", атрымаў два гады зняволення за тое, што надрукаваў узяты з Інтэрнэта тэкст пад назвай „Злачынца павінен сядзець за кратамі". Газету закрылі, нягледзячы на тое, што ўвесь наклад быў канфіскаваны і нумар не трапіў да чытача.

У 1999 годзе паводле прапановы Івашкевіча як віцэ-старшыні БНФ мяне ўключылі ў склад дэлегацыі беларускіх дэмакратычных арганізацый, якая ўдзельнічала ў перамовах з Радай Еўропы і Еўрапейскай камісіяй ў Страсбургу і Бруселі. Я рабіў паведамленне аб парушэннях правоў польскай нацыянальнай меншасці ў Беларусі. Тады добра пазнаёміўся з Івашкевічам і зразумеў, што лёсам роднай Беларусі ён даражыць больш, чым уласным жыццём.

Вяртанне 1937-га?

Анатоль Лябедзька, адзін з дзеячаў беларускай апазіцыі, лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП) 4 лістапада быў затрыманы супрацоўнікамі КДБ пасля наведання амбасады ЗША. Спрабуючы запалохаць, яго некаторы час вазілі па мінскіх вуліцах, пасля даставілі ў КДБ. Лябедзьку папярэдзілі, што ў любы момант ён можа быць арыштаваны за дзейнасць накіраваную на парушэнне канстытуцыйнага ладу. Праз некалькі гадзін яго выпусцілі. КДБ заявіў, што Лябедзька „канфідэнцыйна сустракаўся з замежнымі грамадзянамі іншых краін, якія падазраюцца ў супрацоўніцтве з замежнымі спецслужбамі". Лябедзька абверг гэтыя абвінавачванні і назваў іх „вяртаннем у сталінскія часы".

Прыклад з Лябедзькам пацвярджае тое, што рэжым — паводле меркаванняў апазіцыі — ужо не адважваецца забіваць палітыкаў, спрабуючы іх запалохаць і перашкодзіць палітычнай барацьбе. Згаданая акцыя, несумненна, была накіравана на тое, каб запалохаць апазіцыянераў, якія маюць кантакты з дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі замежных краін. Гэты выпад дорага каштаваў прэзідэнту А. Лукашэнку, які збіраўся паўдзельнічаць у пражскім пасяджэнні НАТА: чэшскі ўрад не выдаў яму візу. З ім абышліся гэтак жа, як і ён доўгі час абыходзіўся са сваімі палітычнымі апанентамі.

Я расказаў у гэтым артыкуле пра лёс толькі часткі добра мне знаёмых дзеячаў беларускай дэмакратычнай апазіцыі. Тысячы беларускіх грамадзян працягваюць змагацца за лепшую будучыню краіны. Многія з іх прайшлі праз турмы, сотні атрымалі адміністрацыйныя пакаранні, штрафы і папярэджанні. Нямала людзей страціла працу з-за сваіх палітычных поглядаў.

Менавіта такой я ведаю беларускую апазіцыю. Іншай у нас няма.

Тадэвуш Гавін

Макаўка ў Еўропе

Ад некалькіх месяцаў у сродках масавай інфармацыі вядзецца прапаганда, якая мае пераканаць грамадзян Польшчы да падтрымкі ідэі далучэння краіны да Еўрасаюза. На гэтую прапаганду выдзелены велізарныя грошы так з дзяржаўнага, як і еўрасаюзнага бюджэту. Слухаючы тэле- і радыёперадачы ў мяне чамусьці складваецца ўражанне, што я ўжо недзе чуў гэтую паэзію. Можа з нагоды 1 мая, ці 22 ліпеня, але тон падобны, нахабны і ашуканчы. Пераключаю апарат на хвалі Радыё Марыя. Там тое самае, толькі што з бальшавіцкім энтузіязмам палохаюць Еўрасаюзам. Паслухаўшы такіх інтэлектуалаў як прафесар Новак, Бэндэр ці вядомы палітык Мацярэвіч чалавек ужо ведае, што ў Еўропе знішчаюць ненароджаных дзяцей і старэчаў толькі таму, што такая ў іх масонская маральнасць. А сярод масонаў, вядома, даюць магчымасць дадумацца слухачам госці айца Рыдзыка — жыдоўская мафія. Высновы ад гэтай нацыяналістычнай прапаганды такія, што калі толькі Польшча стане членам Еўрасаюза — патраціць незалежнасць, маёмасць, хрысціянскую маральнасць, а жонкі беспрацоўных мужыкоў стануць выконваць усялякія паслугі брудным і грубым немцам. Кашмар!

На дзесятках тысяч курсаў і канферэнцый, якія праводзяцца ў Польшчы, вучаць, якое вялікае шчасце прыйдзе разам з уваходам у Еўропу. Стае такі балван перад публікай і ў газетную прапаганду ўкладае свае эмоцыі. А яны тым большыя, чым большы ганарар, які атрымае за сваю балбатню. У школах, апрача звычайных заняткаў, на якіх выкладаюцца веды пра Еўрасаюз, арганізуюцца шматлікія конкурсы аб інтэграцыі. Найбольш здольныя маладыя людзі дэманструюць, як раней камсамольцы, энтузіязм для Вялікай Ідэі.

Бедны беларускі мужык, які нават і не слухае Радыё Марыя, паўтарае тым часам міфы, якія там убіваюцца кожнага дня шматмільённай публіцы. Найбольш баіцца наш селянін таго, што прыйдзе немец і выкупіць яго зямлю, што не будзе каму купляць малака, збожжа і мяса. Катастрофа!

Тым часам усё паказвае, што для Еўрасаюза няма ніякай альтэрнатывы. Для пераважнай большасці грамадзян Польшчы не стане лепей жыць пасля далучэння да Еўропы, але калі б так не сталася, тады для мільёнаў маладых людзей адзінай перспектывай будзе ўцячы абы-куды, нават і за Урал. Еўрасаюз прымусіць перш за ўсё вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца. Ніхто гэтага не любіць, але без вывучэння новых ведаў можна будзе толькі чакаць сацыяльнай дапамогі. Найгорш будзе людзям, якім па прычыне ўзросту цяжка навучыцца новых прафесій. Цяжка таксама стане такім рэгіёнам як Беласточчына, таму што тут нават няма школ, якія адкрывалі б шанц для маладых людзей. Большасць, нават вышэйшых устаноў, гатовая вучыць студэнтаў для абслугоўвання грамадства ва ўмовах сямідзесятых гадоў XX стагоддзя. Мясцовыя інтэлектуалы, якія выхоўваліся на лозунгах кастрычніцкай рэвалюцыі, найбольш ахвотна вярнуліся б у час свае маладосці, у свет, якога ўжо даўно няма.

Еўрасаюз прабуе цывілізацыйна зраўняцца з Амерыкай. Патрабуе людзей, якія маглі б абслугоўваць новыя тэхналогіі, прыстасавацца да пастаяннай адукацыі, авалодаць сістэмы выкарыстання сучаснай інфармацыйнай прасторы. Для лянівых і разлезлых славян, людзей з менталітэтам прыгонных сялян, сацыялістычнага пралетарыяту ці малазямельнай шляхты ў Еўрасаюзе будзе месца параўнальна такое, як імігрантам з паўночнай Афрыкі. Дзеці тых імігрантаў, прынамсі некаторыя, атрымаюць шанц стаць еўрапейскай элітай. Таму Еўрасаюз гэта шанц не для цывілізацыйна адсталага сучаснага грамадства, але для тых, што цяпер ходзяць у школу. За далучэнне да Еўрасаюза павінны прагаласаваць тыя, якія жадаюць лепшай будучыні не сабе, але сваім дзецям і ўнукам.

Беларусы, грамадзяне Польшчы, жыхары Макаўкі, Міхалова, Чыжоў ці Беластока маюць яшчэ і дадатковую прычыну, каб быць зацікаўленымі ўваходам краіны ў Еўропу. Еўрасаюз па сваёй логіцы не пераносіць шавінізму. Можа ў Еўропе загіне гэты ірацыянальны страх, які паралізуе мышленне „нашага хлопца" і прымушае яго пастаянна хавацца ад самога сябе.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Чаравікам іх! Чаравікам?

Дваццаць гадоў таму адзін беластоцкі, актыўны да сёння і цэнены публіцыст ды рэпарцёр пісаў пра дзіўную цягу беластачан хадзіць па вуліцы пад плынь прахожых. Там, дзе трэба абмінаць сябе правым бокам, большасць ішла левым, і наадварот. У выніку людзі абіваліся адзін аб аднаго, абкідаліся праклёнамі, прытым кожны жыў у перакананні, што рацыя на яго баку: гэта ж ягоным бокам тратуара трэба хадзіць. Быццам бы гэтым шляхам, так сказаць, вядомы публіцыст і рэпарцёр стараўся папракнуць жыхароў сённяшняй метраполіі ў недахопе добрых манераў у штодзённым грамадскім жыцці.

Мабыць тое, пра што ён тады пісаў, можа здацца мала сур'ёзным, а нават жартаўліва-кплівым. Але ўспомніў я ягоныя вывады ў апошнія дні, прытлумлены жыццёвымі праблемамі, з якімі не магу справіцца, каб хоць бы дайсці ад майго дому да рэдакцыі „Нівы". Найгорш у аўтобусах. Не гавару ўжо пра схамелую моладзь, якой не ўсхвалюе трымаць срачыскі на аўтобусных крэслах від млеючай, аднаногай і падспелаватай бабулькі. Гэта ўжо норма. На такі від не толькі маладыя ўбіваюць зрок у шыбу, але і старэйшыя, якія быццам думаюць: а чаго ж нам умешвацца.

Найгоршае відовішча, якое стала паўсюдным, звялося да своеасаблівага спаборніцтва пры ўваходзе і выхадзе з аўтобуса і абароне пазіцыі пры саміх дзвярах. Гэта жудасць, калі кожны раз (штодзённа), пакуль праб'юся да выхаду (нават з малазначным словам „прабачце" ці пытаннем: „Ці вы цяпер выходзіце?"), дзверы атакуюць тыя, хто разлічвае выгадна ўставіцца пры парэнчы ці ёмка аперціся на спіну кагосьці з пасажыраў. Прычым у атаку кідаюцца маладыя і старыя, кабеты і мужчыны. Гэтаксама з абаронай прыдзвярных пазіцый.

Калі ў такіх сітуацыях ветлівасць (прабачце, калі ласка і г.д.) не памагае, можна дабівацца мэты хамаватым крыкам. Гэта, аднак, таксама не метад. Выніку, якога хочам, і так не даб'емся, а толькі выклічам брахню. І хоць журналіст не павінен распаўсюджваць г.зв. выхаваўча неадпаведных (не толькі ў адносінах да моладзі) узораў, дык метад на сённяшнія беластоцкія аўтобусныя паводзіны адзін: „Чаравікам іх! Чаравікам!" Толькі што яны таксама выходзяць з такіх самых прадпасылак.

Значыць, трэба ашчаджаць, для таго, каб на старасць дазволіць сабе на камфорт незалежнасці, маючы ўласную аўтамашыну. І тады ўжо будуць іншыя праблемы з... хамамі, у гэты раз матарызаванымі.

Ашчаджаць? А на чым?

Мацей Халадоўскі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Наш абоз у лесе паміж Беразіно і Бялынічамі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Асаблівасці беларускіх лясоў. „Лес — достояние народа". „Не оскверняй родимый Край" (бляшанкай „Завтрак туриста")

Свяжынка ў Мінску

Нашы начлегі — яны запамяталіся найбольш. І гэта не з-за этнаграфічнай цікавасці... *што прысніцца на новым месцы.*

Не. Бывала, ад страху або нечаканых эмоцый, мы не спалі да раніцы.

* * *

Жнівень 1999. Нясвіж на змярканні. Мы замарудзілі, бадзяючыся па мястэчку Радзівілаў. Пра начлег ніхто не клапаціўся. Вось, пойдзем і папросімся заначаваць у нейкім інтэрнаце — думалі.

— Чаво? — прывітаў нас стораж таго ж інтэрната. Дзядзька ледзь стаяў на нагах. Ад яго на кіламетр несла гарэлкай.

— Ведзь меня з-за вас з работы прагоняць! — кінуў у адказ на нашу прапанову.

Мы кінулі намаўляць, бо ведалі, што на такія справы патрэбны тут афіцыйны дазвол. Ды і сам стораж пачаў нас палохаць міліцыяй.

— Цікава тут! — гадалі мы. — Як п'яны да непрытомнасці працаўнік можа палохаць міліцыяй?!

Нам не хацелася разборак. Раней мы начавалі ў інтэрнатах „за долар". Прапанавалі сторажу па адным баксе ад душы, на што ён, задаволены, згаджаўся. Усе былі шчаслівыя. Мы зэканомілі, а чалавек зарабіў нечаканы грош.

У Нясвіжы мы цалкам абселі. Стомленыя, галодныя і брудныя, рашылі заначаваць у лесе. Доўга шукалі месца для абозу. Палаткі ставілі пры месцы. Ад рухлівай шашы на трасе Нясвіж — Мір аддзяляла нас вузкая палоска лесу. На душы было неспакойна. Раней, як на злосць, мы начыталіся мясцовай прэсы, дзе з першай старонкі пісалі пра адны забойствы.

Жах пачаўся ноччу. Усю ноч, здавалася, каля палатак хтосьці хадзіў, хрумкаў, стагнаў...

— То, пэўна, дзік або воўк, — супакойвалі мы сябе. І дзік, і воўк здаваліся нам сімпатычнымі ў параўнанні з героямі крымінальных ньюсаў. Сярод іх быў гвалтаўнік, які сваім ахвярам адсякаў галаву.

Раніцай мы пабачылі, што начавалі... на могілках. Сям-там стаялі хісткія драўляныя крыжы. Паміж імі бегалі худыя падсвінкі з недалёкага хутара.

* * *

Іншы раз, у Свіры, мястэчку над маляўнічым возерам Свірскім, мы не хацелі пераплачваць за начлег у марным гатэлі. За пакой, дзе прапанавалі спаць у нашых спальніках, трэба было заплаціць у пяць раз даражэй чым грамадзянам Беларусі. Разам, за дзевяць душ, заспявалі нам трыццаць долараў (у той час за такія горшы ў Міры наша група магла б паснедаць трыццаць раз у сталоўцы!).

Узнікла практычнае пытанне: „Спаць ці гуляць?"

— Паехалі начаваць на возера! — рашылі ўсе аднадушна. Ноч была цёплая і спакойная. Спявалі птушкі. Мы распалілі вогнішча і пачалі рыхтаваць вячэру. Было раскошна любавацца прыродай і цішынёй, да часу, як... на наш бераг з'явіліся суседзі.

Пад поўнач пачалі з'язджацца машыны.

— Мабыць, мафія якая, — падумалі мы, — а, можа рагатыя проста з пекла. Іх п'яныя разборкі і агрэсіўная лаянка прымушалі нас што і раз прылізваць пастаўленыя на галаве дыбам валасы: — *Лёшка, ты ёб... в рот, пі, ілі ўб'ю цібя! — Што ты мне мазгі еб..! Эта я цібя ўб'ю...*

І так да белай раніцы.

Ужо далёка за поўнач частка нашых суседзяў пайшла лавіць рыбу. Гэтае, здавалася, добрае хобі супакоіць іх, суцішыць. Аднак не. Сваркі і лаянка толькі ўзмацніліся. Нашы рыбаловы глушылі рыбу... электратокам!

У нашай далікатнай кампаніі (тады было сем дзяўчат) узнікла паніка. Многія ў тую ноч прыпомнілі даўно забытыя малітвы. Каб менш баяцца, я надзела купленую ў якасці сувеніра шапку-вушанку з трусіка.

Раніцай браканьеры зніклі, нібыта праваліліся ў зямлю.

Каля нашага вогнішча, на сасне, толькі цяпер мы прыкмецілі пятлю з вяроўкі. Мы распуталі яе і кінулі ў агонь — каб не вяла яна на спакушэнне нейкага Лёшку.

* * *

Цяпер, калі мы з'язджалі з Ішкалдзі ў Мінск, наш шафёр прапанаваў начлег над нейкім возерам. Мы ехалі тым самым шляхам паміж Нясвіжам і Мірам і ўспаміналі...

— Пакіну вас там, а раніцай падбяру, — намаўляў нас. Мы, усё ж, заўпарціліся дабрацца ў Мінск. Тут абяцала прыгарнуць нас на начлег знаёмая пані прафесар. Гуманістка.

Хаця было ўжо пасля дзесяці вечара, Мінск шумеў сталічным жыццём. На ўсходах начнога магазіна, дзе мы рабілі пакупкі, спаў бомж:

— Пайшоў спаць у парк! — праганялі з вачэй нешчаслівуа міліцыянты. Той згорбіўся і пашлэпаў прэч у цемру.

З-за адчыненых акон у блёкавішчах даходзіў гоман і смех. Каля МакДональдса выстойвала моладзь. Маладыя тусаваліся табуном і пад пад'ездам блёка ў нашай знаёмай.

З парога нас ашарашыў пах часначку. На стале ляжала гурба сырых кілбас і кумпякоў.

— У дачкі дэкана вяселле, — паведамляе гаспадыня. Пані прафесар ледзь стаіць ужо на нагах ад стомы. Разам завіхаецца сяброўка, таксама прафесарка.

— Як тут не дапамагчы чалавеку? Вяселле — справа святая. Дэкан сказаў, не было як выкрунуцца.

Прафесарка пачаставала нас смажанай свежанінкай. Мы елі і расхвальвалі вынаходлівасць беларускай гаспадыні. На момант забыліся, што гасцюем у еўрапейскай сталіцы. Здавалася — мы ў роднай хатцы на Беласточчыне, дзе толькі што закалолі вепрука пад Каляды.

Раніцай мы яшчэ раз зірнулі на кватэру ў мінскім мурашніку. Уздагон ляцеў за намі пах вясковай каўбаскі. Ён дзіўна кампанаваўся з прагай вандроўкі. Нам хацелася быць як найдалей ад гарадскіх цэнтраў і тэхнічнай цывілізацыі.

Ганна Кандрацюк

Аўтарскі вечар у Варшаве

Факт удзелу пасла на Сейм Рэчы Паспалітай Яўгена Чыквіна ў спатканні з праф. Яўгенам Мірановічам і рэдактаркай Аннай Радзюкевіч у Варшаўскім аддзеле БГКТ 21 лістапада г.г., сам сабою сведчыць аб асаблівым значэнні сустрэчы. Ва ўступным слове Яўген Чыквін звярнуў увагу на працэс стварэння асяроддзя беларускай інтэлігенцыі ў пасляваенныя гады ў Польшчы, падкрэсліў яе дасягненні ў развіцці беларускай культуры, у тым ліку, у галіне літаратуры, гісторыі ды выдавецкай дзейнасці. Дацэньваючы неабходнасць беларускіх падручнікаў, з задавальненнем падкрэсліў высокую ацэнку падручніка па гісторыі Беларусі, апрацаванага прафесарам Яўгенам Мірановічам, выдадзенага пад рэдакцыяй і ў графічнай апрацоўцы Анны Радзюкевіч. Упэўнены ў важнасці твора, як дырэктар выдавецтва „Ортдрук", пастанавіў выдаць падручнік і забяспечыў асабліва стараннае афармленне, нягледзячы на цяжкасці і выдавецкую рызыку звязаную з недахопам дасведчання ў выдаванні падручнікаў.

А. Радзюкевіч адзначыла значэнне падручніка і ўдалае графічнае афармленне кніжкі, што адрозніваe яе ад традыцыйных выданняў. Тэкст падручніка ясна і зразумела адлюстроўвае гістарычны працэс фармавання культуры, рэлігіі, гаспадаркі ды дзяржаўнасці на беларускіх землях. Першы падручнік па беларускай гісторыі, які паяўляецца ў Польшчы, А. Радзюкевіч пастанавіла ўзбагаціць ілюстрацыямі. Дастакова заглянуць у кніжку, каб пераканацца, што заданне гэтае выканала выдатна. Патрабавала гэта доўгіх падарожжаў па ўсёй краіне, наведання шматлікіх музеяў.

Праф. Яўген Мірановіч адзначыў, што адсутнасць ведаў пра Беларусь у 70-х гадах, сціплая інфармацыя ў школах, вымагала працаёмкіх даследаў, аналізаў, розных канфрантацый, часта супярэчных, навуковых ці псеўданавуковых крыніц. Даследам не спрыяла нізкая нацыянальная свядомасць насельніцтва.

Стварэнне народнага універсітэта ў 80-я гады, даследаванні сярод насельніцтва, пашырэнне дыдактычнай працы з моладдзю выклікалі рост зацікаўлення мінулым народа. На пачатку 90-х гадоў паявілася каля 10 магістэрскіх дысертацый па гісторыі і культуры Беларусі і Беласточчыны, ці беларускай меншасці ў Польшчы. У 1993 годзе паўстала Беларускае гістарычнае таварыства, якое вядзе выдавецкую дзейнасць. За гэты час стварылася база для апрацавання падручніка. Беларуссю і яе дзеямі зацікавіліся навукоўцы заходніх краін: Нямеччыны, Францыі, Англіі. Незалежна ад усяго, не высветлена нямала гістарычных няяснасцей, напрыклад, скандынаўскія ўплывы на ўтварэнне старарускіх народнасцей, утварэнне беларускай дзяржаўнасці ці падвалінаў Вялікага княства Літоўскага. Цэлы рад іншых праблем, звязаных з пачатковымі гістарычнымі дзеямі, астаецца яшчэ ў сферы спрэчак гісторыкаў. Праблемай з'яўляецца пераадоленне гістарыяграфічных стэрэатыпаў. Напрыклад, змена меркаванняў пра Грунвальдскую бітву, дзе сапраўдным пераможцам аказалася прымітыўнае, лёгка ўзброенае літоўска-беларускае простанароддзе пад камандай Вітаўта і Уладыслава Ягайлы, якое перамагло закутых у панцыры непаваротлівых рыцараў праціўніка і тым самым палажыла канец нямецкім крыжаносцам.

Існуючая ўсё яшчэ ў Польшчы сціпласць ведаў пра Беларусь і яе гісторыю, паводле аўтара не абмяжуе зацікаўлення падручнікам да ліцэістаў; можа ён аказацца прыдатным нат працаўнікам Ягелонскага універсітэта.

Выкліканая часткай прысутных палеміка на тэму залежнасці між канфесійным і нацыянальным самаакрэсленнем часткі насельніцтва, блытанне гістарычных паняццяў Літвы, Белай Русі, Чорнай Русі, Жамойці з сённяшнім іх разуменнем, спрэчкі на тэму самаакрэслення „тутэйшасці" патрабавала ад аўтара нямала стрыманай тактоўнасці ў спробах заспакаення стэрэатыпнага разумавання аматараў спрэчак.

Я. Ж.

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

І „б” клас з настаўніцай Валянцінай Бабулевіч

У бельскай гімназіі

Першы „б” клас гімназіі, што ў бельскай „тройцы” — вясёлая кампанія. Так, прынамсі, самі пра сябе мяркуюць гімназісты. Яны яшчэ добра не пазнаёміліся. Праўда, частка з іх вучылася раней у адным класе ПШ. У гімназіі ўсё памянялася. Прыйшлі вучні з іншых класаў. Чатыры асобы — з зусім іншых школ. Цяпер яны даганяюць сваіх сяброў у вывучэнні беларускай мовы.

— У нас 26 вучняў, — кажа Марта Пахвіцэвіч, класная „гаспадынька”.

Выхавацелькай тут матэматык Галіна Федарук. Пакуль цяжка гаварыць пра поспехі класа. З ранейшых — гэта першае месца гандбалістаў у ваяводстве.

Найбольш удзельнікаў конкурсу „Роднае слова”. Самага вялікага поспеху дасягнула Эдыта Перавой, якая выступала ў Нараўцы. Сярод іншых удзельнікаў трэба назваць Віялету Раманюк, Маргарыту Парфянюк, Магду Дамброўскую, Данеля Карпюка, Марту Пахвіцэвіч.

— А я хачу пахваліць яшчэ выдатнікаў па беларускай мове, — кажа Валянціна Бабулевіч, настаўніца беларускай мовы. Настаўніца назвала зноў усіх дэкламатараў і яшчэ Дарафея Садоўскага.

Пра зацікаўленні, якія нарадзіліся ў час урокаў роднай мовы, займальна распавяла Гося Парфянюк. Яна зацікавілася традыцыйнымі вышыванкамі. Натхненнем для яе сталі працы бабулі Анны Савіцкай са Шчытоў і прабабкі Яўгеніі Парфянюк з Бельска-Падляшскага. Гімназістка сама арганізавала выстаўку для сваіх класных сяброў.

— Большасць кашуль і ручнікоў у мяне ў падарунку ад бабуль. Я сцерагу іх як сямейны скарб. Калі гляну на іх, успамінаюцца аповеды пра маладыя гады бабуль. У той час дзяўчына апранала сваю вышыванку на свята і забаву. Дзяўчаты вострa канкуравалі паміж сабой. Вышыванка гаварыла пра ўмеласць, талент ды густ дзяўчыны. Хлопцы, калі прасілі дзяўчат танцаваць, звярталі ўвагу на вышываныя блузкі.

Аповеды Госі вельмі цікава спалучаюцца з інтэр’ерам класа. Кабінет беларускай мовы ў бельскай „тройцы” ўпрыгожаны ручнікамі, макаткамі, кашулямі...

Пагаварылі мы таксама пра свята Каляд. Цікава, усе гімназісты вераць у Дзеда Мароза!

Радак Валкавыцкі таксама найбольш любіць падарункі. Разам з сям’ёй паедзе ў Орлю да бабулі. Там з мясцовымі пойдзе калядаваць.

— У Орлі мне падабаецца, — кажа Радак, — там усе прымаюць калядоўшчыкаў!

І добра плацяць.

У мінулым годзе Радак зарабіў 700 злотых. І ўсім весела было, цешыліся святам. Цяпер трэба калядкі ўспомніць, развучыць новыя — бо ў нас таксама па спеве ацаняюць хлапцоў!

ЗОРКА

Дзённік Міколы

Прыхаваны вораг

У Краіне Гот мы спыніліся на тры дні.

Быў сонечны ранак, другі дзень нашай экскурсіі. Усе селі снедаць. Мы выбіралі садавіну і экзатычныя плады. Толькі Аня не мела ахвоты сілкавацца. Яна хадзіла там-сям са сваім „хлускантам”. Размаўляла з ім, смяялася.

— Цікавая справа, — заўважыў Нор Узі, — як хутка яна памянялася! Такая медыумічная асоба? Проста неверагодна... — і дадаў: — Нам трэба як найхутчэй дзейнічаць. Ані пагражае вялікая небяспека.

— Чаму? — спытаў Ярак. Мы ўсе спалохаліся.

— Яна можа памерці ад чараў, — сказаў мастак.

Мы нічога не разумелі, але ўміг падарваліся на ногі.

— Што нам рабіць? — спытаў Ярак. — Падкажыце, у чым тут справа. Як нам абараніць сяброўку, калі не ведаем, хто вораг?

— Вораг можа прытаіцца ў кожным з нас, — таемна прашаптаў жывапісец.

— Як гэта?

— А так. Ён дзейнічае праз наіўнасць. Кожны з нас больш або менш наіўны.

— Ці ж мы ўжо аж такія наіўныя? — мы глядзелі па чарзе адзін на аднаго, а Нор Узі толькі ўсміхаўся.

— Браткі, — сказаў ён, — кожны Нявінны чалавек Наіўны. Разумееце?

— Не!!! — адказалі мы хорам.

Нор Узі зноў таемна ўсміхнуўся:

— Паслухайце, — сказаў ён, — Аня не ведае, што ў яе вялікая моц. Але... хтосьці іншы пра тое ведае. І таму заняў ёй галаву гэтай цацкай, „хлус-кантам”. Разумееце?

— Ясна, — гукнулі мы ўсе, — нейкі энергетычны ваўкалак да яе падсоўваецца.

— Брава! — пахваліў нас Нор Узі.

Як толькі мы тое сказалі, побач з’явіўся Чорны Кот. Мы збянтэжыліся.

Аня далей хадзіла па лузе сярод дзьмухаўцаў... і спявала.

— Што рабіць? — мы глядзелі на мастака.

— Не будзьце наіўнымі, — сказаў Нор Узі, засмяяўся і дадаў: — Трэба нам так наілгаць, так нахлусіць таму „хлус-канту”! Каб не вытрымаў — і ляснуў! Разумееце?

— Разумеем, разумеем!

Прапанова нам спадабадася.

(працяг будзе)

(нак-с)

Вершы Віктара Шведа

Старыя манеты

Кажа настаўніца: — Мікола,
Просіць цябе пан археолаг,
Каб паказаць мог месца гэта,
Дзе ты знайшоў свае манеты.

Паціснуў Мікалай плячыма,
Кажа, што гэта немагчыма,
Таму што ў гэты дзень, нібыта
Музей у горадзе закрыты.

Стаяў на грашах

Настаўнік запытаў: — Сынок,
Чаму спазніўся ты на ўрок?
— Таму што нейкая дзяўчынка
Згубіла грошы на прыпынку.

— Ты дабрадушны, як відаць,
Ёй грошы памагаў шукаць?
— Ды не, стаяў, хачу прызнацца,
На згубленай пяцідзесятцы.

Радаслаў МАЦІЕВІЧ

Ёлка

Раз быў зімовы дзень.
Елачка марыла,
каб яе забралі з лесу,
прыбралі, як іншых.
І стала яна ёлкай.
Мінулі святы і зіма.
Надыходзіла вясна.
Сонца растапіла снег.
Дзеці выйшлі на падворак.
Убачылі буры шкілет ёлачкі.
„Дзе мая краса?
Дзе маё жыццё?” —
Заплакала ёлка сухой ігліцай.

II „а” кл. ПШ н-р 6 у Беластоку

Караль МАРКЕВІЧ

Малы кот

Кот чорны —
малы кот.
Ля школы —
робіць плот.
Б’е, б’е цвікі
і канца няма.
І крычыць і мяўчыць
А сабака на яго — гаўчыць!
Ты кот — малака папі.

VI кл. ПШ у Нарве

Мая вёска Масева

Масева I (Старое), што ў гміне Нараўка, распаложана на самай вялікай Тушамлянска-Масяўской паляне ў Белавежскай пушчы. Мясцовасць узнікла на месцы даўняга ўрочышча, дзе ў XVII ст. выраблялі паташ. У другой палове XVII ст. тут была пабудавана паташная фабрыка з абсталяваннем для пераапрацоўкі драўлянага попелу. На працу ў фабрыцы прыязджалі людзі з Мазовіі, якіх называлі „буднікамі". Пасля таго, як у 1792 годзе фабрыка перастала існаваць, частка людзей вярнулася ў Мазовію, а апошнія засталіся тут. Яны пачалі высякаць лес і гаспадарыць на сваіх участках. У такі спосаб паўстала вёска, а каля яе фальварак Масева, які пасля трэцяга падзелу Польшчы царыца Кацярына падарыла палкоўніку Дрэнякінаву. У пачатку XIX ст. фальварак арандавала Шыманоўская-Саванеўская. У канцы XIX ст. царскія ўлады хацелі перасяліць жыхароў Масева на Валынь і таму зямлю насадзілі лесам. Людзі аднак не пагадзіліся на гэта і засталіся на месцы. Пражывала іх тут недзе 700 чалавек.

Непадалёк дзяржаўнай мяжы ў лесе захаваліся фрагменты пратэстанцкіх магіл XIX ст. Гэта след пасля таго, як у пачатку XIX ст. ва ўрочышчы Чола (сёння ў беларускай частцы пушчы) пасяліліся немцы. Пасяленцы выехалі перад I сусветнай вайной над Волгу, дзе цар падараваў ім лепшыя землі.

У час II сусветнай вайны — у 1941 годзе — немцы выселілі людзей, а вёску спалілі. Дабытак вывезлі ў Белавежу і Нараўку. Некаторых людзей перасялілі ў раён Пружан і Поразава. Пасля вайны многія вярнуліся ў сваю родную мясцовасць. Людзі пачалі адбудоўваць свае хаты або будаваць новыя. Неўзабаве ў вёску прыехала падраздзяленне пагранічнікаў і тады вёска сапраўды адрадзілася. Салдаты вельмі хутка ўзяліся за адукацыю дзяцей, якіх шмат было ў вёсцы. Першая школа пачала сваю працу ў зямлянках, якія войска збудавала як казармы. Бацькі хутка зрабілі драўляныя лаўкі і сталы ды дзеці пачалі вучыцца. У першым класе былі вучні, якім споўнілася і 8, і 14 гадоў. Урокі былі вельмі цікавыя, таму што салдаты і дзеці вельмі многа спявалі. Вучыцца аднак можна было толькі да сакавіка-красавіка, бо пазней у школьных класах стаяла вада. Пасля двух гадоў навукі ў такіх умовах, была адкрыта сапраўдная 4-класная школа.

У 1970-я гады ў вёсцы перастала існаваць школа, а маладыя людзі пачалі выязджаць у горад.

У канцы 1940-х гадоў у Масева прыязджала кіно, калектывы спявалі песні, пачаў нават дзейнічаць маладзёжны тэатральны гурток.

У 1947-1948 гадах тут жыло 120 чалавек, а зараз пражывае толькі 91 чалавек. У школу ў Нараўку едзіць толькі 7 дзяцей. Тутэйшым жыць тут нялёгка, але турыстам — тут проста рай.

* * *

Пра вёску Масева існуе легенда. Яна гаворыць, што даўным-даўно ў вёсцы была царква, якая разам з людзьмі праваліласся пад зямлю. Ніхто не ведае, чаму такое здарылася. Праўдападобна гэта было пакаранне за грахі. Старыя людзі гавораць, што зараз у гэтым месцы вялікая паляна, на якой расце буйная трава. Калі да зямлі прыкласці вуха, тады можна пачуць літургічны спеў і царкоўны звон.

Інфармацыі сабралі
Моніка ЖЛОБІН і Аляксандра
БЯЛЯЎСКАЯ з Гімназіі ў Нараўцы

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Знаёміліся з пушчай

(заканчэнне; пачатак у папярэднім нумары)

Выйшаўшы з запаведніка дзеці дапалі да ларкоў і купілі крыху сувеніраў. Не было тут замнога часу, бо трэба было спяшацца ў царкву св. Мікалая, дзе ў 10 гадзін чакаў іх белавежскі настаяцель а. Сяргей Корх. Аглядзіны царквы аформіў бацюшка Лявон Анхім, які арэшкаўскіх дзетак навучае рэлігіі. Пра гісторыю царквы вельмі цікава расказаў дзецям а. Сяргей Корх.

Белавежская царква, можна сказаць, асаблівая. Яе фундатарам быў сам цар Аляксандр III, які 20 жніўня 1894 года асабіста візітаваў пабудову. Урачыстасць высвячэння храма адбылася 22 студзеня 1895 года, а высвячаў епіскап літоўскі і віленскі Іеранім.

Царква пабудавана з чырвонай цэглы на фундаменце з абчэсванага каменю. Іканастас выкананы з кітайскага фарфору, які цар атрымаў у падарунку — гэта сёння адзіны такі помнік у Польшчы! Поўнасцю храм быў аддзеланы ў 1897 годзе, перад візітам цара Мікалая II у Белавежу. Агульны кошт будовы склаў 54 тысячы рублёў. У той жа год пракладзена з Гайнаўкі ў Белавежу чыгунка, па якой 27 жніўня 1897 года ўпершыню праехаў поезд везучы цара Мікалая II разам з сям'ёю і світай. Старую драўняную царкву разабралі, а матэрыял з-пад яе аддалі прыходу ў Пухлах і там скарысталі для пабудовы капліцы на могілках.

Далей дзеці падаліся ў Прыродналясны музей, які існуе з 1919 года. Аднак дзеці не былі поўнасцю задаволены, бо другі паверх, з пушчанскімі звярамі, быў закрыты. Усё ж такі дзеці з зацікаўленнем глядзелі вялікую экспазіцыю напханых птушыных чучал ад мініяцюрных калібры да велізарных сцярвятнікаў і арлоў. Парадаваў іх і ўваход па лесвіцы на назіральную вышку; ездзілі таксама ліфтам.

Вяртаючыся, коратка наведалі рэстаран „Двор суддзі Сапліцы". Хлопцы заўважылі там калекцыю розных бутэлек. Стаяла там і прыгожа прыбраная ёлка, а на панадворку — батлейка.

У 12 гадзін экскурсія вярнулася ў Арэшкава. Парадавала ў той дзень надвор'е, было спакойна і цёпла. Усе дзеці былі радасна настроены, бо экскурсія была цікавая і дзеці многа ад яе даведаліся. У арэшкаўскай школе ўстанавілася традыцыя, што пасля экскурсіі дзеці на ўроках пішуць пра яе кароткія сачыненні, уносяць свае заўвагі.

У невялікай, але прыязнай арэшкаўскай школе большасць вучняў (28 з 49) вывучае родную беларускую мову. Як сказала настаўніца беларускай мовы Ірэна Герасімюк, усе вучні стараюцца, ахвотна чытаюць „Зорку". Пастаянна падпісваюць „Ніву" Крыстыян Дунда (II клас), Пётр Герасімюк, Рафал Камароўскі, Ася Галёнка, Альжбета Антасюк і Бэата Аксютыч (III клас) ды Наталля Свірыдзюк (V клас).

Міхал Мінцэвіч

Польска-беларуская крыжаванка № 51

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 47: Нагода, мяч, амяла, план, хроніка, юрта, ігра, ткач, смак, ар, нос, варвар, клас, айсберг. СМІ, чарга, морква, яна, Ас, гукі, актава, акрай, ключ, кант, абсяг.

У гэты раз не было ніводнага правільнага адказа. Відаць, найбольш праблем было з разгадкай góry lodowej — па-беларуску (як і па-англійску): айсберг.

▶		Wróżka	Orlec	Smoła	Fan	Zakon	▼		
As	Fosforyt ▶ / Figa	▼	▼	▼	▼				
Ferma ▶ / Wiolonczela	▼					Czas		Los	
▶						▼		▼	
Marka		Jał	▶		Anioł	▶			
▶									

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вучні ПШ н-р 2 з настаўніцамі Ірэнай Рыбак і Гражынай Внучка

Малая айчына

У Падставовай школе н-р 2 у Гайнаўцы 25 лістапада была адкрыта выстаўка „Мая малая айчына", якую арганізавалі вучні і настаўнікі ў рамках конкурсу „Szkoła z klasą". На мерапрыемства запрошаны былі прадстаўнікі іншых школ і гарадскіх улад. Пасля афіцыйнага адкрыцця, якое ўзначалілі дырэктар школы Збігнеў Будзынскі і інспектар па справах асветы Гарадской управы Нэля Шчука, гасцей пачаставалі квашанымі агуркамі і вясковым хлебам са шмальцам.

Раней вучні прымалі ўдзел у мастацкім і літаратурным конкурсах, якія тычыліся малой і вялікай айчыны. Найлепшыя мастацкія працы апынуліся на выстаўцы, а літаратурныя работы чыталіся ў школе. У сваіх працах наймалодшыя дзеці акцэнтавалі свой дом, школу, горад і наваколле. Старэйшыя вучні пісалі гістарычныя працы аб Польшчы. Ірэна Рыбак, Гражына Внучка і Бажэна Тарэсяк, якія арганізавалі выстаўку, разам з вучнямі адправіліся ў вёскі Гайнаўшчыны і сабралі многа вясковых прыладаў працы, старую мэблю, вопратку і прадметы штодзённага карыстання, якія саставілі асноўную частку выстаўкі. На покуці павесілі праваслаўную ікону ўпрыгожаную вышываным ручніком, а побач палажылі старую Біблію і малітоўнік. Сабралі старыя дакументы, духоўную літаратуру і прэсу перыяду Народнай Польшчы. Побач польскіх часопісаў памясцілі стары „Беларускі каляндар" і тыднёвік „Ніва". Сярод дакументаў палажылі школьнае пасведчанне выдадзенае на беларускай мове ў 1971 годзе ў Кнаразоўскай школе. На выстаўцы многа старых сямейных фатаграфій і генеалагічныя дрэвы, якія саставілі вучні з дапамогай бацькоў і бабуляў. Побач замясцілі старую вопратку, якую насіла мясцовае насельніцтва.

— Паказваем культурную, рэлігійную і нацыянальную разнароднасць нашых зямель. Выстаўка разбудзіла ўспаміны аб мінулым і заставіла задумацца аб сваіх каранях, — сказала Гражына Внучка.

Сярод сабраных экспанатаў настаўнікі арганізавалі ўрокі гісторыі, польскай і беларускай моў.

Аляксей Мароз

Пудра ў чадры

У творчасці выдатных мастакоў жывапісу і скульптуры вельмі часта бачым выявы зусім голых асоб. Несвядомаму гледачу такія шэдэўры могуць паказацца папросту свайго роду парнаграфіяй. А ўжо зусім скандальна можа ім загучаць тлумачэнне, што тая галізна вынікае з рэлігійных палажэнняў. Мабыць усе ведаюць, што ў раю людзі жылі-былі голымі, але калі саграшылі, тады сталі апранацца; падобныя ўяўленні былі і ў іншых касмагоніях. У тых мастацкіх алегорыях, вельмі часта з менавіта рэлігійнымі сюжэтамі, у голым відзе прадстаўлялася Праўда; чыстая Праўда не мела чаго саромецца, не мела патрэбы нічога скрываць, засакрэчваць. А калі здаралася справа неяк нячыстая, тады той брудны элемент трэба было схаваць, спярша пад фігавыя лісткі, а пасля, як сёння гаворыцца, пад сукно. І яшчэ: такія галацелыя пасяганні ў сакральную сферу, думаю, здараліся маладым і юрлівым мастакам, а абурэнне і агіда раслі з ростам, асабліва глядачак.

Гэтак бывала не толькі ў шырокім свеце, але здараецца і ў нашым засценку, хаця, магчыма, мы гэтага не бачым. Ужо вось другі раз у мінаючым годзе папала пад заядлы абстрэл старэйшых цётак наша Паўліна Шафран. Бо напісала яна голую праўду. Пісала яна прыстойна, не пра „габарыты", але пра невялікія плямкі на целе іхніх куміраў. Ну і накінуліся на яе санавітыя панюсі з энергіяй іспанскага быка. Мо тыя матроны розняцца між сабою фармальнай адукацыяй, але яднае іх назапашаны гадамі рэальны менталітэт, які фармаваўся тады, калі праўда была захутана як узорная калгасніца, а моду праўдзе задавала слаўная маскоўская „Правда".

Ці магла спадарыня Паўліна напісаць інакш? Не адно магла, але і павінна! Таго цела сваёй тэмы нельга было пакінуць голапраўдным. Трэба было праўду апрануць і ў максі, і ў міні, і ў бікіні, і ў *topless*, і запудраваць яе, і замазаць крэмамі — каб выглядала як пластмасавая лялька Барбі, як вокладка жаночага журнала, як упакоўка з-пад чыпсаў, з-пад піва — каб можна было яе пасля выкінуць у сметнік. Ці клікнуць мышкай і паламаць, і разарваць, і ўзарваць як камп'ютэрны суб'ект-аб'ект. Каб не была рэальнасцю, толькі каляровай і пустой бутафорыяй яе.

У прыватных размовах і ў публічных прамовах разнавідныя і паны, і панюсі, а агульна кажучы — большасць нас — наракаем на многія праявы нашага публічнага жыцця. Але ж паралельна прыватныя нашы паводзіны — выдатныя. Мы, для прыкладу, носім невялічкія падаркі нашым дабрачынцам, мы за тое, каб забіраць багатым і даваць бедным, мы хвалім нашых любімых куміраў. І мы адначасна асуджаем хабарніцтва, праз якое ні з чым нельга прабіцца. Нас гнявіць, калі нейкі хітруга-прайдзісвет выцягне грошы з чужых, найчасцей нашых, кішэняў. Мы з агідай гаворым пра крывадушнасць палітыкаў і палітыканаў ды апладзіруем Лукашэнку або Лепэру, якія акампаніруюць нам.

Снежаньскі абуральны ліст канчаецца адрасамі палітычных больш-менш навічкоў. І спадзяваннем на іх, што яны не дапусцяць голай праўды ў палітычныя салоны. Што яны захаваюць статус-кво. Што самыя яны хуценька пераапрануцца ў бабаў-ягаў ці кашчэяў. Што праўда будзе шчыльна апранута з галавы да пят, запудравана, закрэмавана і зататуіравана.

Мы ж яшчэ і шчыра набожныя — *алчущие и жаждущие правды*.

Аляксандр Вярбіцкі

Фільмавы вечар

Зіма, зіма — чалавек павінен радавацца! Але што рабіць, калі тэмпература нізкая і чалавек марыць толькі аб гарбаце з мёдам? Найлепш выбрацца з каханай асобай на шпацыр, а потым пайсці ў кіно. Чаму туды? Адказ вельмі просты: дзе нам будзе прыемней патрымаць каханага за руку, або скрасці пацалунак, а пры нагодзе добра адпачыць! Толькі ў кінатэатры! На гэты тыдзень прапаную тры фільмы.

„Жыццё або штосьці накшталт" (*Life or something like it*) аўтарства Стывена Герэка з Анджэлінай Джолі, Крыстыянам Кейнам і Эдуардам Бэрнсам у галоўных ролях, гэта забаўная гісторыя маладой жанчыны, якая, спаткаўшы на вуліцы „дзіўнага прарока", даведваецца, што перад ёю застаўся толькі тыдзень жыцця. Аказваецца, што ў Лэні Керыган, тэлезоркі, прыгожай, таленавітай і дзейснай жанчыны, з вялікай хатай, найноўшым тыпам самахода, адданым і закаханым нарачоным, жыццё страціла ўсялякі сэнс. Дзяўчына мае толькі тыдзень, каб змяніць сваё жыццё. Ці паспее? Пабачце самі!

„Атака павукоў" (*Eight legged freaks*) у рэжысуры Элары Элкэйема прапаную аматарам баевікоў і жахаў. Дзея фільма адбываецца ў малой шахцёрскай мясцовасці. Галоўны герой — Крыс МакКормак (у гэтай ролі пабачым Дэйвіда Аркета), вяртаецца пасля дзесяці гадоў у родныя старонкі. Жыццё не пазваляе яму аднак адпачыць... Выкід таксічных рэчываў даводзіць да катаклізму — звычайныя павукі перамяняюцца ў вялікія мутанты, якія пачынаюць валодаць горадам. Крыс разам з Сэм, дзяўчынай, у якой кахаўся ў маладосці, стараюцца адхіліць небяспеку, але калі павуціннем будзе аблеплена дачка Сэм, усё змяняецца... Як закончыцца гэтая гісторыя, праверце самі!

„Джо Ніхто" (*Joe Somebody*) рэжысёра Джона Паскіна — гэта камедыя, сцэнарый якой напісала само жыццё. Джо, мужчына ў сярэднім узросце, адчувае, што яго жыццё — гэта вялікая памылка. Адышла жонка, якую ён далей кахае, на працы яго не павышаюць, а сябры па рабоце... лепш не гаварыць! Усё змяняецца, калі адзін яго супрацоўнік прыніжае яго на вачах Наталі, яго дачкі. Гэта становіцца крытычным момантам у жыцці Джо. Герой фільма вывучае каратэ, змяняе прычоску, адзенне. Жыццё паступова змяняецца. Жонка хоча вярнуцца, сябры адносяцца з пашанай. Але ці гэта будзе трываць доўга? Ці чалавек можа аж так адмяніцца? Пераканайцеся самі!

У фільме пабачым такіх акцёраў, як Цім Ален, Джулі Баўэн, Келі Лінч, Грэг Герман ці Джэймс Белушы.

Паўліна Шафран

Як Малы Клаўс дабро злом здабываў

Страшная казка для дарослых

У славянскіх казках дурны і слабы мацнейшы ад злога. Бо дабро перамагае ўсё. Праўда, здараюцца жахлівыя пакаранні злога — а то ў кіпучым малацэ які злоснік зварыцца ці раздзяруць яго чэрці, але ў выніку застаецца ў нас, малых і старых, радасць, што дабро пераможа ўсё, і, пасля бяседы, дзе хіба толькі расказчыку „ў рот не пападала", „будуць яны жыць доўга і шчасліва", калі яшчэ не жывуць. Начыталася я за сваё жыццё казак розных, і еўрапейскіх, і азіяцкіх, і афрыканскіх... З казак відаць ментальнасць і душу грамады, не толькі аднаго чалавека. Казка кажа ўсё аб народзе. Аб яго ментальнасці, жыцці і марах. Лялечны тэатр, калі па-філасофску спрабаваць асэнсаваць і натуру лялькі, і патрэбу ігры і быццам бы тлумачэння натуры свету і сусвету спосабам як бы „дзіцячым", ідучы да першабытнае істоты існавання чалавека, тварца і Бога, ёсць вяртаннем нас, дарослых, у тую глыбінную „прымітыўную" душу, першабытную. Дзіцяці, якое здзівіцца і здзіўляецца.

Беластоцкі лялечны тэатр, у якім працуюць выдатныя артысты, выраслыя перш за ўсё з беластоцкай тэатральнай школы (з якое выводзіцца больш за палова дзейсных акцёраў і рэжысёраў „лялек" ва ўсёй Польшчы, дарэчы, мастакоў не толькі тэатра лялечнага) ставіць п'есы не толькі для дзяцей. Дарослыя глядзелі „Дэкамерон", „Хай жыве Панч" і іншыя пастаноўкі з матывамі, якія не падыходзілі малой публіцы, выкарыстоўваючы не толькі рознага віду лялькі, але і акцёра, маску. Герой таксама быў іншы, як той цынічны забойца і нахаба Панч. І калі я вяла свайго васьмігадовага сына на прэм'еру казкі („Малы Клаўс і Вялікі Клаўс") паводле Яна Крысціяна Андэрсэна „Як здабыць карэц золата", памятаючы добра, пра што яна, не падумала, які жахавік прыйдзецца глядзець малому ўражліваму чалавеку.

Казка вядомая. Пачынаецца ад смерці старога хілага каня-бедака, якога (каня) даканаў Вялікі Клаўс, жорсткі і прагны багацей. Малы Клаўс, шляхам інтрыгі, ашуканства і шантажу, помсліва даводзіць да таго, што праз чужую смерць здабывае багацце. Са зла вырастае яшчэ большае зло. Цынічная прага багацця вядзе да таго, што без хвіліны роздуму і ваганняў, са звычайнага чалавека вырастае забойца. І дзея дзеецца хутка — макабра змяняецца жахам, спрытны Малы Клаўс (у выдатным выкананні і аперавaнні лялькай вядомы акцёр Мечыслаў Фёдараў) з простага пачцівага небагатага чалавека становіцца каварным забойцам.

Ці варта пайсці ў лялечны тэатр з дзіцём? Ва ўсіх нас сядзіць дзіцёнак — гэта толькі так паказваемся, што з патомкам ідзем на „фільмавыя ранкі" ці ў тэатр на п'есы для дзяцей. Марым, проста, вярнуцца ў маленства. А аднаму даросламу ж не выпадае ісці на такую п'есу... На „Клаўсаў" — лепш ужо, калі выбрацца, дык, на маю думку, аднаму ці... з калегам. Варта — свята для вока. Такая казка.

Міра Лукша

З серыі „Вашыя і нашыя”

Дружба... нты

Дзяўчынка хадзіла надта важная і задаволеная. Нехта мог бы падумаць, што гэтак дзеецца таму, што нядаўна споўнілася ёй васемнаццаць і адчувала яна сябе ўжо дарослай. Нават сварылася з мамай, што і посуд будзе мыць толькі тады, калі якраз захоча.

Не, дзяўчынка была радаснай і вясёлай па той прычыне, што яе добрая сяброўка і сваячка папрасіла, каб была яна старшай дружкай на яе вяселлі. Во дзе гонар! Во дзе шчасце!

Дзяўчынка пачала думаць пра сваю сукенку, а таксама пра тое, як упрыгожыць самаход, на якім паедзе маладая пара вянчацца ў царкву, бо гэта ж быў яе абавязак як старшай дружкі.

Сяброўка, якая выходзіла замуж, сказала ёй, што за старшага можа ўзяць сабе свайго хлопца, або якога захоча. Можа быць і католік, нікому гэта перашкаджаць не будзе.

Дзяўчынка пачала думаць, каго б тут узяць. Свайго хлопца ў яе яшчэ не было. У апошні час сябравала з адным вучнем з суседняга ліцэя, пару месяцаў прыходзіў у яе школу, калі толькі яна канчала заняткі, чакаў. Цешыўся, калі яна дазваляла яму ісці, трымаючыся за рукі. Казаў, што большага шчасця яму не трэба. Бывалі таксама разам на дыскатэках. Усё ж такі нельга было яго назваць яе хлопцам.

Тым не менш дзяўчынка вырашыла запрасіць яго на старшага. Хлопец ахвотна згадзіўся, хаця быў католікам. Для яго не мела значэння, дзе будуць вянчацца маладыя: у царкве ці касцёле. Ён хацеў быць на гэтым вяселлі разам з дзяўчынай, якая яму падабалася намнога больш за іншых. Зрэшты, нават яго бацькі нядаўна запрасілі яе на вячэру да іх.

Заставалася дзесяць дзён да вяселля, калі хлопец ля яе школы сказаў, што бацька катэгарычна забараніў яму браць удзел у гэтым „прадстаўленні”. Бацька яго (з тыповым беларускім прозвішчам) стаяў на каленях перад тэлевізарам і плакаў, калі трансліравалі візіт папы рымскага ў Польшчы, хаця ўмеў рабіць людзям розныя свінствы, расказваў яго сын. А цяпер во з-за сына нават пасварыўся з жонкай.

Што было рабіць дзяўчынцы? Яна пачала шукаць ахвотнага. Сяброў у яе было мноства. Яна добра танцавала і на забавах кожны хацеў быць яе партнёрам. Калі аб'яўлялі нейкі конкурс на танец, у залежнасці ад таго, які гэта быў танец — лацінаамерыканскі ці, напрыклад, рок-н-рол, яна выбірала сабе адпаведнага партнёра, бо жадаючых было многа, а яна арыентавалася, хто ў чым добры. Бывала яна ў розных кампаніях, і можна было меркаваць, што сябры і сяброўкі яе любілі.

Дзяўчынка звярнулася да хлопца, з якім сядзела за адной партай. Лазіў за ёй, як цень, ад першага класа ліцэя. Часта бываў у яе дома, сядзелі пры камп'ютэры, яна бывала ў яго.

Гэты хлопец прынамсі быў шчыры. Што? У царкве? Не, дзве гадзіны трымаць у руках карону то я не буду!

Тады дзяўчынка звярнулася да яго сябра, які таксама быў у іх „пачцы”. Адразу ён згадзіўся. Праз пару дзён (відаць, спытаўся ў бацькоў) пачаў выкручвацца. Кажа, што якраз вось бацькі запланавалі нейкую паездку і бяруць яго з сабою. Не глядзеў ёй у вочы, калі гаварыў гэта.

Яшчэ вырашыла яна запытацца ў чацвёртага хлопца, які таксама бываў у яе дома і быў вельмі мілы ў адносінах да яе. На наступны дзень ён паведаміў, што ў яго неспадзявана „выскачыла іншая, вельмі важная імпрэза”.

Дзяўчынцы было вельмі крыўдна. Яны ж заўсёды ахвотна хадзілі з ёю на розныя вечары, самі запрашалі яе, добра сябе адчувалі ў кампаніі з ёю, а цяпер... Царква ім перашкаджае, не магла ўцяміць яна, ці мо толькі іх бацькам?.. Якраз усе гэтыя хлопцы былі католікамі.

Дзяўчынка была ў роспачы. Не разумела, што дзеецца. Ну, мо крыху разумела, але не магла зразумець сваім маладым сэрцам, чым царква горшая за касцёл. Тым, што ў царкве хрысцяцца трыма пальцамі, а не цэлай далонню, як у касцёле?.. А мо тым, што святы адзначаюцца паводле старога стылю... Ці праваслаўныя — не такія самыя людзі і ці ў царкве інакш пахне, чым у касцёле...

Доўга не рашалася яна пазваніць сваёй сяброўцы і сваячцы, што з дружбантам у яе нічога не выйшла. Урэшце рашылася. Тая пачала смяяцца: што ты, у нас ахвотных — колькі хочаш, возьмем кагосьці з запрошаных гасцей, бо я думала, што ты б хацела сама выбраць хлопца на дружбанта...

Дружбант аказаўся цудоўным хлопцам, а да таго прыгожым і статным. Гулялі на вяселлі да раніцы і не было мовы аб тым, што магло ім быць нудна, хаця дагэтуль яны не зналіся. Дзяўчынка нават нейкі момант думала, каб запрасіць яго на сваю стаднёўку, але пасля перадумала: сярод яе сяброў і сябровак мог бы ён адчуваць сябе няёмка.

Вырашыла пайсці з тым „шчырым” сябрам, які пабаяўся, што цяжка яму будзе трымаць карону ў царкве над галавой маладое. Усё ж такі чатыры гады за адной партай! А да таго папрасіў яе, каб была яго партнёркай, бо забавы з іншай ён не ўяўляе. Не хацела яна насіць у сабе злосці.

Сын „багабойнага” бацькі надалей падыходзіць да яе школы і ўздыхае, але больш за рукі яны не бяруцца.

Ада Чачуга

Дом апекі „Арка”

6 снежань астанецца памятным днём у жыцці вёскі Кожына Кленіцкага прыхода. У гэты дзень быў адкрыты яшчэ адзін Дом сацыяльнай апекі. Дом апекі „Арка” і маленькую ў ім царкоўку Барыса і Глеба пасвяціў мітрапаліт Сава, падзякаваўшы перш за ўсё Богу і ўсім тым, якія прычыніліся да пераўтварэння гэтага знішчанага аб'екта (у мінулым была школа, а пазней турма) для патрэб людзей, апынуўшыхся ў вельмі цяжкім становішчы.

Ініцыятарам прыстасавання будынка на сацыяльныя мэты з'яўляецца айцец Аляксандр Высоцкі, настаяцель Кленіцкай царквы.

— Тут падрыхтавана і абсталявана адна- і двухмесныя пакоі на 40 чалавек, — расказваў мне а. Аляксандр. — Прынята ўжо 10 асоб. І гэта ўсё дзякуючы людзям добрай волі.

Называе ён паасобныя прадпрыемствы, установы і фірмы, а таксама людзей, якія ўнеслі вялікі ўклад у стварэнне так патрэбнай установы. Сярод іх Антаніна Філіпюк з Бельска, Пётр Бурак і Сяргей Плева з Беластока, айцец Міхаіл Дудзіч з Варшавы, Праваслаўнае брацтва св. Мікалая і іншыя.

У бажэственнай літургіі ўдзельнічалі святары з Бельска, Нарвы, Гайнаўкі і Брэста. Прыйшло на ўрачыстасць шмат людзей, прыехалі на аўтобусе братчыкі і братчыцы з Беластока, якія неаднойчы дапамагалі ва ўпарадкаванні будынка і наваколля, а таксама прывозілі сабраныя ад людзей рэчы (тэлевізар, пасцель, адзежу) і шмат чаго іншага. Сярод запрошаных гасцей былі, між іншым, сенатар Сяргей Плева і намеснік Падляшскага ваяводы Ежы Паўяновіч.

Міхась Хмялеўскі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Кіраўнік Зінаіда Кендысь з апекуном і жыхарамі дома

Вучаць жыць у асяроддзі

У святкаваннях пяцігадовай дзейнасці Гайнаўскага дома сацыяльнай самадапамогі, якія адзначаліся ў канцы лістапада, прынялі ўдзел намеснік Падляшскага ваяводы Ежы Паўяновіч, намеснік старасты Гайнаўскага павета Ежы Сірак, намеснік бурмістра Гайнаўкі Міраслаў Мордань і гайнаўскія святары. Пра дзейнасць дома расказала яго кіраўнік Зінаіда Кендысь ды ўручыла спонсарам дыпломы і мастацкія працы, выкананыя жыхарамі дома. Госці павіншавалі юбіляраў і паглядзелі тэатральныя выступленні падапечных.

Дом распачаў сваю дзейнасць у жніўні 1997 года і да сённяшняга дня пакарысталася ім каля 90 асоб. Зараз з сямі гадзін раніцы да пяці гадзін пасля абеду ў доме займаецца пад 35 асоб. Трапляюць сюды людзі з псіхічнымі расстройствамі, накіраваныя сюды працаўнікамі Гмінных асяродкаў сацыяльнай дапамогі. Найбольш сярод іх жыхароў Гайнаўкі, якіх давозяць на машыне. У доме працуюць дзве групы, у якіх вядуцца заняткі адпаведныя да псіхафізічных магчымасцей пацыентаў і іх індывідуальных патрабаванняў. Вучаць іх правільна трымаць сябе ў штодзённым жыцці, умела праводзіць вольны час і ўдзельнічаць у грамадскім жыцці. Абяздоленыя, якія наведваюць дом, вучацца рыхтаваць харчаванне, шыць, прыбіраць, іграюць на музычных інструментах, рыхтуюць прадстаўленні і выконваюць мастацкія працы.

— Мэтай нашай дзейнасці з'яўляецца інтэграцыя наведвальнікаў нашага асяродка і разбуджэнне іх актыўнасці. Намагаемся развіваць у іх умеласці, неабходныя для самастойнага жыцця ў асяроддзі. За пяць гадоў заўважылі мы, што ў нашых жыхароў меншая рызыка вяртання хваробы, — паведаміла Зінаіда Кендысь. — Некаторыя пацыенты трапляюць да нас пасля закрытага лячэння ў бальніцах і трэба памагчы ім вярнуцца ў сваё асяроддзе. Шкада толькі, што мала вяскоўцаў рашаецца высылаць да нас сваіх сямейнікаў. На вёсках пражывае многа людзей, якім патрэбна наша апека.

Мастацкія працы жыхароў дома паказваліся на выстаўках у Гайнаўцы і Беластоку. Іх аўтары ўзнагароджваліся на аглядах непрафесійнага мастацтва Гайнаўскай зямлі, арганізаваных Гайнаўскім домам культуры. Жыхары дома прымалі ўдзел у дэкламатарскіх і музычных сустрэчах і аглядах. Штогод арганізуюць Куццю. Ад студзеня 2000 года пры доме дзейнічае Таварыства „Быць разам”, якое рэалізавала праект „Бліжэй сябе”, фінансаваны пасольствам Каралеўства Галандыі. Выдае яно свой часопіс і арганізуе адукацыйныя спатканні са спецыялістамі Медыцынскіх інстытутаў Варшавы і Беластока.

Аляксей Мароз

У жыццёвую самастойнасць

Расце лік сірот і грамадска адчужаных дзяцей. Такім дзецям павет павінен забяспечыць апеку. Дзейнічаюць дзве асноўныя мадэлі нагляду за такімі дзецьмі: прытулачная і сямейная.

Павятовы цэнтр дапамогі сям'і (ПЦДС) у Бельску-Падляшскім клапоціцца і пра прытулачны, і пра сямейны нагляды. На аснове пастановы Сямейнага суда, пасля зрасходавання магчымасцей аказання дапамогі натуральнай сям'і або аддачы ў часовую сям'ю, кіруе дзіця ў апякунча-выхаваўчую ўстанову. У Бельскім павеце няма такіх устаноў і за імі трэба разглядацца па ўсёй Польшчы. Паводле інфармацыі Уршулі Кітляс, загадчыка ПЦДС, у першым паўгоддзі г.г. 10 дзяцей былі назначаны для адпраўлення ў апякунча-выхаваўчыя ўстановы. Чацвёра з іх ліку апынуліся ў маладзёжных выхаваўчых асяродках, двое чакае памяшчэння ў дзіцячыя дамы, а чацвёра — прыёму ў рэсацыялізацыйныя ўстановы. З-за цяжкіх фінансавых умоў прытулкаў і росту паталогій сярод дзяцей і ў іх сем'ях, ПЦДСу цяжка памясціць такіх дзяцей з Бельскага павета ў апякунчыя ўстановы. Па гэтых прычынах некаторыя дзеці чакаюць у чарзе нават па некалькі месяцаў.

На тэрыторыі Бельскага павета функцыяніруюць 37 часовыя сем'і, у якіх пражывае 44 дзяцей. У першым паўгоддзі 2002 г. на пагашэнне коштаў утрымання асірацелых дзяцей у такіх сем'ях зрасходавана 142 374 злотых.

Асобе, якая ў апякунча-выхаўчай установе або ў часовай сям'і дасягае дарослацьць, прызначаецца дапамога на жыццёвае ўладкаванне і інтэграцыю з асяроддзем шляхам грамадскай працы і фінансавай дапамогі. У Бельскім павеце такая дапамога ахоплівае 17 дарослых выхаванцаў, якія працягваюць навуку. Асновай аказання дапамогі з'яўляецца распрацаваная ПЦДСам праграма і абавязацельства дарослага выхаванца ў яе рэалізацыі. ПЦДС наглядае за ходам ажыццяўлення праграмы і падказвае належныя меры для выхаду ў самастойнасць.

Міхал Мінцэвіч

Родам з Беласточчыны

Аляксандр Гяршун

Выдатны беларускі і рускі фізік і оптык Аляксандр Гяршун нарадзіўся ў 1868 годзе ў горадзе Саколка на Беласточчыне.

Бацька яго Леў Гяршун быў доктарам у Саколцы, вельмі адукаваным чалавекам. Таму ён вельмі хацеў, каб і сын атрымаў таксама добрую адукацыю. Ён адправіў Аляксандра на вучобу ў Віленскую гімназію, дзе юнак сур'ёзна вывучаў замежныя мовы і матэматыку. А пасля заканчэння гімназіі, Аляксандр Гяршун працягвае вучобу ў Пецярбургскім універсітэце на фізіка-матэматычным факультэце. Падчас вучобы ў Пецярбургу Аляксандр Гяршун займаўся рэпетытарствам, пісаў навуковыя артыкулы для тэхнічнага часопіса „Электричество". Для гэтага выдання ён нават перакладаў тэксты з замежных навуковых часопісаў, а пасля заканчэння універсітэта ў 1891 годзе, стаў сакратаром рэдакцыі гэтага часопіса.

Праз два гады Аляксандр Гяршун пакідае часопіс „Электричество" і ўшчыльную супрацоўнічае з прафесарам фізікі Ф. Петрушэўскім, які ўзначальваў фізічны аддзел Энцыклапедычнага слоўніка Бракгаўза і Эфрона. Для гэтага слоўніка, а таксама для часопіса „Электричество" (не парывае з ім сувязі) наш зямляк піша навуковыя артыкулы па фізіцы, оптыцы, фатаграфіі і электратэхніцы. Дарэчы, яшчэ студэнтам Аляксандр Гяршун напісаў сур'ёзную працу „Крытычны разбор даследавання пытання аб тэмпературы найбольшай шчыльнасці вады і водных растворaў". Менавіта гэтая праца стала пачаткам ягонай навуковай дзейнасці. Прачытаўшы яе, пецярбургскі прафесар Іван Боргман адзначыў здольнасць маладога Гершуна хутка працаваць, сістэматызаваць багаты, фактычны матэрыял і супастаўляць яго з раней напісанымі.

Пасля заканчэння універсітэта Аляксандр Гяршун працуе не толькі ў часопісе „Электричество", але і на кафедры фізікі ў родным універсітэце. Тут ён грунтоўна зацікавіўся праблемамі вытворчасці аптычнага шкла. Менавіта гэтае зацікаўленне і стала асновай усяго ягонага жыцця.

Аптычнае шкло, як лічыў наш зямляк, павінна ўдасканальвацца. Гэта ён даказаў у 1894 годзе на адным з пасяджэнняў Рускага тэхнічнага таварыства, дзе выступіў з дакладам на тэму „Аб прыборы для даследавання якасці аптычнага шкла". Але перад тым, як выступіць з дакладам, наш зямляк прадэманстраваў прыбор уласнай канструкцыі. Прысутным і даклад, і прыбор спадабаліся.

Праз год А. Гяршун наведвае Германію, а вярнуўшыся адтуль, піша і выступае на пасяджэннях з дакладам „Аб аптычных заводах Шота і Цэйса ў Іене".

У час руска-японскай вайны выявілася, што расійская армія слаба забяспечана оптыкай. Выпраўленне гэтай памылкі практычна лягло на плечы Аляксандра Гершуна. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам на Аляксандрыйскім заводзе пачаўся выпуск артылерыйскіх аптычных панарам, дасканаласць якіх пацвердзіла нават аўтарытэтная камісія. А ў 1914 годзе ў Пецярбургу пад кіраўніцтвам Аляксандра Гершуна быў пабудаваны оптыка-механічны завод. Адначасова працавала і майстэрня Абухаўскага завода, дзе рамантавалі дальнамеры розных сістэм, якія тады знаходзіліся на ўзбраенні ў расійскай арміі. І ўсё гэта кантралявалася фізікам і оптыкам з Саколкі прафесарам Аляксандрам Гершунам.

Наш зямляк працаваў вельмі многа. А 26 мая 1915 года ў яго адбыўся сардэчны прыступ, які каштаваў таленавітаму ініцыятару рускага аптычнага ваеннага прыборабудавання цэлага жыцця. Праўда, справа Аляксандра Гершуна не памерла. Да яе спрычыніўся ягоны сын Андрэй Гяршун — адзін з найбольш вялікіх святлотэхнікаў і фотаметрыстаў, заснавальнік навуковай школы ў галіне гідраоптыкі. Ён закончыў фізіка-матэматычны факультэт Ленінградскага універсітэта (1924). Працаваў лабарантам, навуковым супрацоўнікам, начальнікам лабараторыі Дзяржаўнага рускага аптычнага інстытута (1920-52). У 1937 годзе абараніў доктарскую дысертацыю, быў прафесарам па спецыяльнасці святлотэхніка (1937). Напісаў больш за 90 навуковых прац. У асноўным гэта ў галіне святлотэхнікі (штучныя і натуральныя асвятленні, святломаскіроўка, маячныя сістэмы), тэарэтычнай фотаметрыі (святлавое поле, распаўсюджванне святла ў паглынаючым святлорассейваючым наваколлі, фотаметрычны інварыянт, тэрміналогія), гідраоптыкі (даследаванні марскіх вод, бачнасць у вадзе, маскіроўка караблёў, прыборабудаванне). Андрэй Гяршун (1903-1952) быў узнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР, двойчы атрымліваў Сталінскую прэмію другой ступені.

Сяргей Чыгрын

Памяць жыве ў народзе

На тэрыторыі Чаромхаўскай гміны знаходзяцца могілкі салдат, якія загінулі ў час I і II сусветнай вайны. Грамадскасць з пашанай адносіцца да гэтых месц. У Вульцы-Тэрахоўскай устаноўлены помнік ахвярам фашызму, дзе пакояцца астанкі савецкага афіцэра Уладзіміра Харытонава і дзесяці расстраляных фашыстамі жыхароў вёскі: Сцяпана Гаўрылюка, Хведара Зінчука, Яна Гаўрылюка, Юзафа Далжынскага, Мікалая Шакала, Васіля Гаўрылюка, Васіля Назарука, Сцяпана Раманчука, Васіля Барана і Уладзіміра Барана.

На каталіцкім могільніку ў пасёлку захаваны астанкі безыменных салдат, якія загінулі ў абароне Айчыны ў 1918-1920 гадах. На тым жа могільніку знаходзіцца магіла безыменнага салдата з 1939 года. У лесе побач дарогі ў напрамку дзяржаўнай граніцы пахаваны салдат польскага войска з 1939 года Анджэй Свірскі. У лесе за Кузавай знаходзіцца могільнік з 35 магіламі з I сусветнай вайны (у гміннай дакументацыі запісана, што гэта могільнік з II вайны. Старажылы Кузавы гавораць, што там захаваны астанкі нямецкіх салдат з 1914 года). На могільніку ў Кузаве захаваны астанкі савецкіх салдат загінуўшых у апошняй вайне. Колькасць і прозвішчы — невядомыя. На кузаўскім могільніку пахаваны лейтэнант Савецкай Арміі Юрый Картошын.

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Кузаўскі могільнік з I сусветнай вайны

Да нядаўна могілкамі апекаваліся вучні Пачатковай школы ў Чаромсе. Зараз патранат над ваеннымі могілкамі прыняла гміна. Ваявода падляшскі заключыў дагавор у гэтай справе і прызначыў сёлета гміне 1 000 зл. на аднаўленне магіл. Як гавораць працаўнікі гміны, гэта невялікія грошы, каб прывесці ў належны парадак падпарадкаванае ім месца памяці. Незалежна ад таго сёлета была выканана агароджа і ўстаноўлена пліта на магіле безыменнага салдата на каталіцкім могільніку. Адноўлена агароджу і крыж на супольнай магіле салдат з 1918-1920 гадоў, як і адноўлена агароджа і помнік на магіле безыменных савецкіх салдат на кузаўскім могільніку. У наступным годзе гміна зоймецца іншымі помнікамі. Ушанаванне памяці памерлых сведчыць аб станоўчых адносінах мясцовага самаўрада, як і грамадства да тых, што затрацілі жыццё ў імя нашай свабоды.

Уладзімір Сідарук

Ваенныя эпізоды

Успаміны Уладзіміра ТРАХІМЧУКА з калёніі Дзернякова.

Як немцы наступалі, то хутка, бо рускія разбітыя былі. Салдаты не ведалі дзе дзецца, сувязі не было. Частка ў гаспадароў асталася, а пасля немец усіх пазабіраў.

Немцы дэсант на самалётах вазілі, самалёт прызямляўся ў полі і немцы выходзілі. Нашай вёскі не бамбілі, але бамбілі Гарадок.

Палонных па шашы гналі, гналі табуном, як кароў. Каторы палонны абуты, а каторы босы. Як хто вады з калюжыны хацеў папіць, то немец — пстрык, і ўсё.

Хадзілі партызаны. Усе жыхары вёскі мусілі хадзіць на чыгунку, вартаваць адрэзкі. Калі хто адрэзка не дапільнаваў і поезд узарваўся, то расстрэл. Таму і партызаны дзейнічалі стрымана.

Быў сакавік 1942, а мо і 1943 года. Эшалонам на фронт ехалі эсэсаўскія спецыялісты. І той поезд узарвалі каля Дзернякова. Прымаразак тады быў, мала снегу. У вагонах печкі гарэлі і многія немцы папаліліся. Вагоны пакруціла, *страшавіска* было. У вёсцы думалі, што ўжо Дзернякова не будзе. Ад нас многа было чыгуначнікаў, усіх іх у бункер сагналі і мелі расстраляць. Але пусцілі сабаку, а той следу ў вёску не знайшоў, толькі ў другі бок. І так вёска ацалела.

Як рускія наступалі, немцы адступалі. На рэчцы Супрасль, якая круг робіць вакол Міхалова і Гарадка, немцы паставілі абарону. На скрыжаванні дарог акопы выкапалі, а каля нас рушнікарня нямецкая была. За намі стаялі гарматы і білі ў Гарадок, а меншыя бліжэй Гарадка.

Немец нам чужую карову далучыў. Мы тры дні бегалі, каб яе не згубіць. Немец клікаў нас: „Komm!" і шакалад нам даваў, суп. Мы паямо, а тая карова ўцякае то туды, то сюды, а мы бегаем. На чацвёрты дзень яе не выгналі. То ён нам палкаю ўліў, а мы як зайцы скакалі.

Яшчэ перад фронтам амаль усе ў лес паўцякалі, толькі жанчыны з малымі дзецьмі асталіся; два тыдні ў лесе сядзелі. Немцы школу замініравалі і загадалі ўсім у школу на сход сысціся. А некаторыя бачылі, як міны закладалі. І людзі не пайшлі ў школу, толькі ў лес; і так перажылі.

Фронт спярша ў Бабруйніках пастаяў, пасля ў Вераб'ях і ў Гарадку. У Случанцы вялікі бой быў, палова вёскі згарэла. 22 ліпеня да нас прыйшла руская разведка і паведаміла, што можам вяртацца — фрыца прагналі. І ўсе фурманкі адправілі ў Беласток ехаць, адбіраць раненых і ў палявы шпіталь вазіць.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Маладой карэспандэнтцы Анастассі

Варунак: мае быць цікава!

Доўга вагаўся спадар Астрон, ці даць мне прагледзець карэспандэнцыю Анастассі ў „Ніву". Не хацеў мо, каб нехта кепска падумаў пра яго падапечных, або баяўся кагосьці пакрыўдзіць. Але ўсё ж рашыўся і зноў папрасіў, каб я дала нейкі адказ і Анастассі, так як калісьці зрабіла гэта Зосі.

І так я хутка стану, пэўна, сакратаркай Астрона.

Вельмі добра, Анастасся, што і ты вырашыла пісаць у „Ніву", як твая сяброўка з класа. Здаецца, спадар Астрон і заклікаў да гэтага моладзь. „Ніва" толькі скарыстала б, маючы свежыя інфармацыі з Гайнаўскага беларускага ліцэя, ды і не толькі. Але вось менавіта. Ты сама сцвярджаеш, што твой артыкул „вельмі асабісты, таму што датычыць мяне і маіх «сяброўак» з класа, якія вельмі любяць пляткаваць, а я гэтым артыкулам хачу навучыць іх пакоры".

Анастасся! Праўду кажучы, асабістыя справы лепш вырашаць на іншым форуме, а не ў „Ніве". А тым больш „вучыць пакоры". Нам патрэбны інфармацыі крыху іншага тыпу.

Ты разрысавала свой канверт ледзь не так, як Зося, твая сяброўка з класа, ды і беларуская мова ў цябе някепская. Трэба было б яе толькі крыху падшліфаваць, выкінуць яўныя паланізмы.

Думаецца мне аднак, што працу ў журналістыцы трэба пачынаць з іншага боку. Мэтай тваёй не павінна быць ахвота адпомсціць сяброўцы, якая хоча сябраваць з хлопцам, што падабаецца табе, прынізіць яе, як кажуць, укусіць. Пісанне трэба пачынаць ад дробных інфармацый, хаця і тут ёсць небяспека, што ты пры мосціках ды калдобінах на дарозе і застанешся. Інфармацыі могуць быць дробныя, але маючыя глыбокі сэнс. Столькі ж усяго дзеецца навокал, а асабліва сярод маладых. Свае артыкулы трэба абаперці на назіраннях: за падзеямі ў школе і дома, за лесам, птушкамі і звярамі — за ўсім, што акружае нас і дае нам у жыцці задавальненне, або нас абурае несправядлівасцю.

Тое, што дзяўчаты не падзялілі між сабой хлопца, старое, як свет. Не варта з гэтага рабіць палітыку, растрасаючы гэту справу. Вы яшчэ маладыя: сёння падабаецца адзін, заўтра — другі. Цікава, ці хлопцы таксама да такой ступені растрасаюць мужчынска-дамскія праблемы...

Іншая справа, што і гэтыя справы можна вырашыць на старонках „Нівы".

Варунак: мае быць цікава!

Анастасся! Я твой артыкул прачытала не менш шасці разоў. Не, не падыходзіць ён для „Нівы". Круціла я яго ў руках і так, і гэтак. Задоўгі ён, цяжкаваты стыль, ну, і, як я ўжо казала, тэма, тэма не чытаецца. Мо калі б яна інакш была апісана...

Паслухай, у мяне ёсць для цябе прапанова. Ты напісала, што ёсць у цябе ўжо ідэі для іншых артыкулаў. А таксама ты пішаш вершы і можаш іх прыслаць. Шкада было б, каб твая ахвота, твая цяга да пісання змарнавалася.

Таму, кажу, пішы, узяўшы пад увагу, што ты пішаш у газету, і ўлічыўшы нашыя заўвагі. Спявачку і актрысу Юстыну Стэчкоўскую ты ж ведаеш, праўда?! А калісьці яна выступіла ў „Szansie na sukces" і яе нават не вылучылі ніякім чынам. А цяпер, бачыш, якую яна зрабіла кар'еру...

Усё ў жыцці магчыма!

Ада Чачуга

Быць ці не быць чыгунцы?

Падае чыгунка — чарговы стратэгічны сектар нацыянальнай гаспадаркі. Арганізаваныя на базе ПКП суполкі ўзаемна сведчаць сабе паслугі. Але не дабіліся яны станоўчых вынікаў, толькі ўвагналі ў агульным падліку холдынг ПКП у вялікую задоўжанасць. Абмежаваныя датацыі на падтрымку рэгіянальных перавозаў не пакрываюць высокіх коштаў перавозчыка. Падляшская маршалкоўская ўправа не падпісала кантракта на выкупку лініі з чыгункай і вінавата перавозчыку 1 578 тыс. злотых. Што чакае суполкі ў новым годзе? У чыгуначным крузе гаварылася аб вяртанні да даўнейшай структуры. Як будзе, цяжка сказаць. Адно пэўнае, Прадпрыемства рэгіянальных чыгуначных перавозаў у Беластоку шукае паратунку. Для іх гэта „быць, або не быць". Разумеецца, што справа тычыцца грошай. Ад 1 верасня г.г. быў адменены пасажырскі цягнік з Чаромхі ў Беласток у 19^{13} і з Беластока ў Чаромху ў 8^{40}. Заступілі рэйкавым аўтобусам. Эканоміка! Дырэкцыю не хвалюе лёс пасажыраў і тое, што не забеспячае падарожным належных умоў (брак санітарыятаў). Яе цікавяць грошы, а не чалавек!

20 лістапада г.г. наведаў я намесніка старасты Ежы Сірака, з якім гаварылі аб праведзеным рамонце на лініі Чаромха — Бельск — Страбля. Тое, што мне вядома, гайнаўская дарожная секцыя Польскіх чыгуначных ліній памяняла на згаданым адрэзку больш трох тысяч шпалаў. Затым я прапанаваў, каб староства выступіла да чыгуначных начальнікаў з просьбай павышэння хуткасці да 50 км/гадз. Суразмоўца пагадзіўся з прапановай і паслаў неабходны службовы ліст начальніку Гайнаўскай дарожнай секцыі. Чакаем адказу.

І яшчэ адно. Агульнапольскае таварыства самаўрадаўцаў у карысць лакальных чыгунак у Быдгашчы паслала адкрыты ліст міністру інфраструктуры Марку Полю з патрабаваннем дапамагчы чыгунцы як самаму таннаму і бяспечнаму сродку транспарту. Таварыства ў звароце да генеральнага дырэктара Мацея Мэнцлеўскага прапануе прымяніць на лакальных лініях скідкі і не дапусціць да іх ліквідацыі. Абодва лісты былі пасланы 19 і 20 жніўня 2002 г. Можна спадзявацца належнага водгуку ад начальнікаў. Калі не, дык прапаную гайнаўскім і бельскім самаўрадам з'яднацца і дабівацца станоўчага рэзультату ў слушнай справе. Ліквідаванне чыгуначнай інфраструктуры на тых тэрыторыях абазначае цывілізацыйную дэградацыю беларускай меншасці на Падляшшы. На такое нельга дазволіць!

Уладзімір Сідарук

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Стадола ў агні

Пажарнікі — ратаўнікі універсальныя

Пажарнікаў выклікаюць не толькі да пажараў ці дарожных выпадкаў. Сёння пажарнік мусіць умець, для прыкладу, зняць з даху ката, вызваліць замёрзлага ў ільдзе лебедзя ці абясшкодзіць небяспечны рой восаў ці яшчэ горшых шэршняў.

— Нейтралізацыю небяспечных насякомых праводзім ужо ад некалькіх гадоў, — гаворыць Ян Шкода, прэс-сакратар Павятовага камандавання пажарнай аховы ў Бельску-Падляшскім. — У 2002 годзе было таксама звыш дзесяці выклікаў, да чаго спрычынілася, мабыць, спрыяльнае надвор'е.

— Ці гэта праўда, — пытаю, — што больш не будзеце займацца такімі нетыповымі дзеяннямі, а будуць гэта за аплату рабіць спецыялізаваныя службы.

— Цяжка мне цяпер адказаць на такое пытанне, аднак сёння мы ўмеем гэта рабіць і — робім. Агулам, у гэтым годзе мы выязджалі каля двухсот разоў да пажараў і каля ста васьмідзесяці разоў да іншых мясцовых небяспечных выпадкаў. Найбольш было выездаў да пажараў траў у вясенне-летні перыяд, шмат і да спальваемай на полі саломы. Каля 30% усіх пажараў на тэрыторыі павета склалі пажары гаспадарчых будынкаў.

— Ці былі фальшывыя выклікі?

— Здарыліся ў гэтым годзе, аднак не былі яны зламысныя, калі напр. праязджаючы шафёр паведамляў з мабільніка пра дым на тэрыторыі суседняга павета. У нас дзейнічае сістэма ідэнтыфікацыі абанентаў і можам даведацца з-пад якога тэлефоннага нумара быў выклік.

— Якія былі найважнейшыя падзеі мінаючага года?

— Мы правялі каардынуючыя вучэнні ратавальных службаў на тэрыторыі лясного масіву Выліны ў Надляснiцтве Рудка. Быў гэта сімуляваны пажар, у тушэнні якога ўдзельнічалі пажарныя часці ад павятовых каманд з Бельска-Падляшскага і Высокага-Мазавецкага, іншыя каманды з гэтых паветаў, уключаныя ў краёвую ратавальную сістэму і службы Надляснiцтва Рудка.

Міхал Мінцэвіч

Вер – не вер

Дарагі Астроне! Адгадай мой сон як мага хутчэй, непакоюся, ці не прадказвае ён нешта дрэннае. Паўгода таму памёр мой сваяк, а ў сне нібыта ўжо гадавіну яго смерці сям'я спраўляе. З'ехаліся сваякі і я між імі таксама. Людзей вельмі многа, усе ходзяць, проста таўкуцца ў хаце. Нарыхтавана шмат розных страў, але ў той цеснаце я іх не магла ўбачыць. Я трымаю ў руцэ порцыю печанага кураняці і, ходзячы, абгрызаю яго. І толькі ўсё.

Вера

Астроне! Сніцца, што я на рабоце. Працуем, як заўсёды, а тут адчыняюцца дзверы і ўваходзіць сяброўка, якая таксама на гэтым жа прадпрыемстве працавала. Але знясіліла яе працяглая хвароба і яна даволі доўга на бальнічным лістку. Я глянула радасна, здзіўлена, як жа яна прыйшла? Сяброўка стаіць такая прыгожая. Валасы ў яе светлыя, сярэдне доўгія і круцяцца. А твар такі маладзенькі, быццам у дзяўчыны. Гляджу я і захапляюся.

Праз некалькі дзён сніцца мне ізноў падобны сон. Цяпер бачу я сваю дачку (яна ўжо немаладая). Стаіць перада мною. Я гляджу, а яна такая маладая, прыгожая. Твар гладзенькі, беленькі.

Што ж абазначаюць гэтыя сны?

Марыся

Вера! Твой сон гаворыць аб тым, што ёсць у цябе ворагі, якія палаюць у адносінах да цябе зайздрасцю, злосцю і нянавісцю. Цябе сапраўды можа чакаць сумная падзея, звязаная з хваробай або нават пахаваннем некага. Аб усім гэтым гаворыць той натоўп гасцей і стравы, якіх было поўна ў хаце, а ты нават абгрызала порцыю печанага кураняці.

Марыся, што датычыць тваіх сноў, дык яны прадвяшчаюць добрае, бо калі сняцца жанчыны, а да таго прыгожыя, дык так і спадзявайся радасці і задавальнення. Іншая справа, калі б табе прыснілася старая і брыдкая баба. Гэта прадвяшчала б плёткі, смутак і жаль.

Астрон

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2003 r. upływa 5 marca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

ГАРА... доцкая

„Даўціпы"
Андрэя Гаўрылюка

Ксёндз, ходзячы па калядзе, націскае кнопку дзвярнога званка.

— Ці гэта анёлак? — пытае гаспадыня.

— Не, але я з тае самае фірмы.

* * *

— Куды ссылаюць бацюшку, які занадта знюхаецца з беларусамі?

— У Новы Сонч Астатэчны.

* * *

— Празмерна хвалюецеся гэтым неўрозам; жонка ваша дажыве з ім да ста гадоў!

— А я?

Факты і высновы

Rodzaj wiary

Profesor Antoni Mironowicz przed drugą turą wyborów na prezydenta Białegostoku nie opowiedział się jednoznacznie ani za Turem, ani podstarzałym doktorem. Z właściwą subtelnym umysłom pokorą dodał tylko: — Jako prawosławnemu bliższe są mi wartości chrześcijańskie. Jest więc zrozumiałe, że wolałbym, aby prezydentem został Ryszard Tur.

Arkadij Inuk-Mukluk („Czasopis")

Улічваючы той факт, што „podstarzały doktor" і Ryszard Tur rymakatoliki, выказванне прафесара было сапраўды вытанчанае.

Сідар Макацёр

Свінская справа

Рашыў я быць добрым грамадзянінам. Ужо тое, што жыву — адзін клопат для дзяржавы. Я, як пенсіянер, абдзіраю нашу краіну найменш удвая. Хоць за сваё працавітае жыццё назбіраў я на сваю пенсію з наддаткам, цяпер мяне ўтрымлівае армія маладзейшых, якія, вось, штомесяц плацяць складчыны на розныя „філяры", а перш за ўсё — на ЗУС. Той дзеліцца грашамі з II філярам, але не ўсё ўплачвае. Чаму ж? А павінен. Вінен. Гэта яго абавязак. А не будаванне харомаў на найдаражэйшай зямлі ў цэнтры ваяводскага горада. У гэтым палацы справы афармляюцца ў меншым будынку (туды мае доступ наведвальнік — пенсіянер і будучы пенсіянер ці рэнтыст) — а побач, з каменю, сталі і шкла — у чатыры разы большая будуніна, дзе сядзяць чыноўнікі. Ага, у тым меншым будынку прымае наведвальнікаў лекар, які пастанаўляе аб тым, ці ты страціў здароўе. У апошні час у ЗУСе адбываюцца сапраўдныя незвычайныя справы. Наступаюць цудоўныя аздараўленні ледзь жывых людзей. Ды не пішацца пра тое ў друку ці адпаведных кнігах, як хоць бы Антонавай Мірановічавай тыпу „Кніга цудоўных аздараўленняў у святыні па вуліцы Млыновай у Беластоку". Мабыць, таму, што лекары-*ажэчнікі* — зусім не святыя.

Паламала нагу мая знаёмая. Насіла гіпс, як належыцца, пару месяцаў. І такі самуткі пералом мела пару гадоў таму (7 працэнтаў інваліднасці), у гэты раз лекар „даў" ёй нуль. Баба чыкілдае далей (ужо без гіпсу), тым разам у Суд працы. А тамака — табуны паламанцаў, пакручаных, што адагнуцца не могуць, за сэрцы трымаюцца, хістаюцца на нагах. Гэта не ахвяры хвароб, толькі ЗУСаўскія цудоўныя аздараўленцы, што рашыліся (маюць, значыць, яшчэ сілу!) судзіцца з гэтай фірмай...

— Ты што, Вандал, рассакатаўся на той ЗУС няшчасны! — Агата зларадна ўсміхаецца. — То ж трэба фірму ўтрымаць за грошы ад тых, хто яшчэ плаціць. А што будзе, калі пенсіянерамі стане тая ўсё малеючая армія тых, хто яшчэ сёння на нагах і штосьці робіць для гаспадаркі краіны?

— А дзе тая гаспадарка? Яна яшчэ наша?

Тут з яхіднай ухмылкай азваўся наш малады гданьскі сваяк, што прыехаў на свята.

— Вы што, бачу, супраць Еўропы?

Агата падсунула яму вялікую місу з вяндлінай:

— Ты, Адась, у свеце бывалы. І паесці любіш. Частуйся, ацані наш смак. Або не, не дам табе паляндвічкі ды каўбаскі вясковае...

— А што тут вы, цётка, жарты якіясь. Дам — не дам! Нарабілі смаку і зараз — фэрць! — забіраеце! — тут аблізнуўся. — Вядома, смак у нашых прадуктаў найлепшы, але ў іх з мяса — больш мяса.

— А што, каровы больш мясістыя? Ці шпрыцуюць у Еўропе спачатку жывёл усім там розным, а пасля ўжо само мяса так насычваюць вадой ды цудамі ўсялякімі, што сапраўды — з кілаграма мяса маеш 20 кіло кумпяка.

— Не павінны вы, цётка, чытаць „Выбарчай газеты"! — Адась дадумаўся, адкуль у цёці Агаты такія звесткі.

— Ага, тут я цябе маю! — пачырванела Агата. — Зараз пачнеш пра жыдоўскую мафію, масонаў...

— Папрадаваліся!

— Самі папрадаваліся! А ўвогуле, дык табе і так гэта мяса забяру. Хочаш ведаць — дык ты павінен есці кашэрнае. Што, бацькі не сказалі?

Вандал Арлянскі

Мядзведжы зыход

Мядзведзь Сандар Жоржавіч перад апошнім сходам уселяснога кіраўніцтва справіўся з задачай, якая не давала яму заснуць зімовым сном. З крэктам узлез на пень старога дуба, цэнтральнае месца паляны. Каб іх вялічаства былі яшчэ больш саноўнымі, рашылі яны стаяць на задніх нагах. І, вось, сталі гэтак, пераступаючы час ад часу з нагі на нагу, бо даймаў мароз, а да сходу часу яшчэ было шмат. У задуме Жоржавіч не заўважыў нават, як акружылі яго супрацоўнікі. Дзік Свіналыч глянуў з немым пытаннем у сваіх кабановых вачах на дзятла Стукача, заўважаючы ў ягоных птушыных вочках адабрэнне. Захрумкаў так гучна, што з дрэваў наўкол паляны асыпаўся снег на меншых сяброў уселяснога кіраўніцтва. З зайца Генадзя было толькі відаць ягоны хвосцік, а вавёрка Кацюша выглядала, быццам толькі што вярнулася з распродажу новай калекцыі зімовых футраў. Дзікова хрумканне вярнула мядзведзя на зямлю. Праўда, не так, каб сысці на яе з пня старога дуба, — Сандар Жоржавіч толькі вярнуўся думкамі на паляну.

— Вось, сёння бачыце мяне ўва ўсёй маёй велічнасці, сябры. Я ў вашых вачах такі, які ёсць. Згодна з унушэннямі ды намёкамі, што даходзяць да нас з далёкіх лясоў, дзеля дабра гаспадаркі нашай лясной звярыны, я рашыў пакінуць пост.

Члены ўселяснога кіраўніцтва акамянелі. Сталі яны як укапаныя, зрабіўшыся падобнымі да елак ды хвоек, цяпер бясснежных пасля хрумкання Свіналыча.

— Ну, як гэта так? — атрэслася ад снегу і шоку вавёрка Кацюша.

— А, вось, так і так! — адказаў ёй пабратэрску ды шматзначна Жоржавіч. — Не бойцеся. Нічога не зменіцца ў вас. У дэмакратычных выбарах выбраны будзе мой наступнік. Дэмакратыя кіруецца здаровым розумам і выявіць новага лясного правадыра — дзятла Стукача.

Члены кіраўніцтва, быццам іх пхала нейкая невядомая сіла, наблізіліся да дзятла.

— Я... — кончыў прамову мядзведзь. — Я буду аддаляцца ў глыб лесу. Памаўчу, крыху, урэшце, пасплю. Ведаю, аднак, што без мяне не справіцеся, і вы, дзяцел, і вы, усе апошнія. Урэшце ж я, адзіны, магу змерацца на сілу хоць бы з ваўком з Уладзімірскага лесу. Таму я, быццам бы, адыду, быццам памаўчу, быццам пасплю. Каб вам аблегчыць справу, не буду абвяшчаць дэкрэтаў, а высылаць іх з глыбіні лесу даверaным птаствам. Так вось, дзяцел, адчувайце сябе кіраўніком. Памятайце, усё ж, пра гэта: ваша ўлада — у нашых лапах. Свету, аднак, аб гэтым усім не трэба ведаць. Справа ясная!

— Ыгм! — паўтарыла за Стукачом усё кіраўніцтва.

— Дык, вось, аддаляюся. Так бы мовіць: будзьце, кіруйце сабе самі. Вядома, без перабольшвання, як кажуць у Лядскай пушчы — бэз пэрэсады. Вядома, як быццам бы.

І зышоў мядзведзь з пня старога дуба.

МакХолад

Двухлітарная крыжаванка



Гарызантальна: 1. род шпулі, валіка, 3. шлях, шаша, тракт, гасцінец, 5. сакрэтная ўмоўная фраза для апазнання сваіх у канспірацыйных абставінах, 7. славянская Венера, 9. жыллё барсука, 10. сталіца Славакіі, 11. войлачная або кардонная затычка, якой забіваюць зарад у зброі, што зараджаецца з дула, пыж, 12. верхняе адзенне праваслаўнага духавенства з шырокімі рукавамі, 14. вочы коле, 16. невялікае паморскае паруснае судна для рыбалоўнага промыслу і перавозкі грузаў, 17. яма на дарозе, выбітая коламі.

Вертыкальна: 1. Алесь, беларускі паэт (1918-83), 2. левы прыток верхняй Амазонкі, які ўліваецца ніжэй Ікітас, 3. Уладзімір, рускі мовазнаўца (1801-72), 4. старадаўняе мнагавёсельнае судна, якое рухалі катаржнікі, 6. Павел, савецкі маршал бранятанкавых войск, 8. добры чалавек, 9. іспанская правінцыя з Памплонай, 11. драўняная канструкцыя для пераходу цераз рэчку, 13. Леў, грамадскі дзеяч Вялікага княства Літоўскага (1557-1633), 14. металічная прылада для прасавання, 15. сталіца Бангладэш.

(Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 45 нумара

Гарызантальна: абат, осмій, Урарту, хлор, норма, Катмай, Абенгуру, Чанша, цагельня, Петрыкаў, Луара, дзесятак, карыес, гайка, Апіц, марабу, глоса, Луар.

Вертыкальна: істота, кірмаш, бальніца, Турку, банту, страж, Абашыдзе, археолаг, Чэпу, нота, Льва, мяжа, аўсяніца, Укаялі, Ракасі, шалаш, дымар, есаул.

Рашэнне: **Не той грош, што ляжыць, а той, што бяжыць**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

ISSN 0546-1960